СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 7.32, 17.16, 9.44;
Віцебск — 7.25, 17.02, 9.37;
Магілёў — 7.21, 17.05, 9.44;
Гомель — 7.15, 17.06, 9.51;
Гродна — 7.47, 17.32, 9.45;
Брэст — 7.43, 17.36, 9.53.
МЕСЯЦ:
Першая квадра 11 лютага.
ІМЯНІНЫ:
Трыфана; Зянона, Валянціна.

ЗВЯЗДА

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 40 кап.

14 ЛЮТАГА 1992 г.
пятніца, № 32 (21810)

РОЗГАЛАС

З ВІДАМ НА ЦЕСНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Укладваць сродкі толькі ва ўзаемавыгадныя, канкрэтныя і перспектыўныя праекты — такі галоўны вынік сустрэчы Старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь Вячаслава Кебіча з галандскай урадавай дэлегацыяй на чале з камісарам каралевы Нідэрландаў у правінцыі Дрэнтэ панам В. Меерам.

Гэта візіт у адказ прадстаўнікоў па-сяброўску прыхільнай да нас дзяржавы на мінулагоднюю паездку беларускага прэм'ера ў Галандыю. Каля года абодва бакі прыглядаліся адзін да аднаго, шукалі агульныя пункты для цеснага дзелавога супрацоўніцтва. Цяпер яны вызначылі галоўнае. Гэта— ахова здароўя, будаўніцтва, банкаўская справа, перапрацоўка сельскагаспадарчай прадукцыі і селекцыйна-племянная работа.

Госці прывезлі ў дар рэспубліцы партыю медыкаментаў і медыцынскага абсталявання.

У гэты ж дзень дэлегацыю прыняў кіраўнік беларускага парламента Станіслаў Шушкевіч, адбыліся гутаркі ў дэпутацкіх камісіях.

(БЕЛТА).

«Мы на плошчу людзей клікаць не будзем»

Так заявіў на сустрэчы са Старшынёй Вярхоўнага Савета рэспублікі С. Шушкевічам лідэр Канфедэрацыі працы Беларусі М. Собаль.

Так склалася, што літаральна адна за адной адбыліся дзве сустрэчы Старшыні Вярхоўнага Савета С. Шушкевіча — з дзеячамі Федэрацыі прафесіянальных саюзаў і прадстаўнікамі Канфедэрацыі працы Рэспублікі Беларусь. Таму міжволі напрошваюцца параўнанні.

Прадстаўнікі афіцыяльных прафсаюзаў прыйшлі ў Вярхоўны Савет, як высветлілася, зусім не з канструктыўнымі прапановамі аб паляпшэнні сацыяльна-эканамічнага становішча. Большасць патрабавалі ў першую чаргу вырашэння любой цаной толькі сваіх уласных «цэхавых» праблем — падатковых ільгот, паставак, заробку і г. д. І іншы раз няёмка было за тых прамоўцаў, што зрываліся на істэрычны тон ультыматумаў і пагроз, кідалі ў адрас кіраўніцтва парламента неабгрунтаваныя абвінавачанні.

Удзельнікі той, першай, сустрэчы адназначна выказалі свае намеры: мы павядзём людзей на плошчу, і тады вы ўбачыце, што гэта такое...

Зусім іншая пазіцыя ў Канфедэрацыі працы Беларусі.

— Мы на плошчу людзей не павядзём, — запэўніў старшыня Міхаіл Собаль. — Не будзем заклікаць і да адстаўкі парламента і ўрада, бо лічым, што ў гэты нялёгкі для рэспублікі час усе навінны падзяліць адказнасць за яе далейшы лёс. На першае месца Канфедэрацыя ставіць сёння прававы нацiск на тыя афіцыяльныя структуры і тых асоб, што перашкаджаюць працэсам перабудовы эканомікі і грамадства.

Аддадзім належнае ўдзельнікам гэтай, другой, сустрэчы ў парламенце. Яны прыйшлі не для таго, каб спекуляваць на цяперашніх цяжкасцях і падаграваць люмпенскія настроі, а каб разам з кіраўніцтвам рэспублікі знайсці шляхі вырашэння балючых праблем, вызначыць стратэгію і тактыку дзеянняў прафсаюзаў на гэтым этапе.

Лейтматывам сустрэчы стала пытанне аб прыватызацыі. І тут думкі часцей выходзіліся на адным: акрамя ўсяго іншага, трэба разгарнуць шырокую растлумачальную работу, бо людзі застаюцца ўбаку, не ведаючы, што хтосьці ўжо добра грэе рукі за іх спінай... Больш таго, іх запалохваюць цяжкасцямі, спрабуюць увесці ў зман, каб такім чынам праводзіць ціхую «прыхватызацыю» для вузкага кола. З гэтай нагоды гучалі папрокі ў адрас Камітэта па кіраванню дзяржаўнай маёмасцю пры Савеце Міністраў. Прынятыя ім падзаконныя акты аб прыватызацыі, адзначалі прамоўцы, скіраваны супраць рабочага чалавека, затое дазваляюць былой партыйнай наменклатуры, што зараз на чале адпаведных структур, адхапіць лепшыя «кавалкі».

Аб гэтым гаварыў у ліку іншых старшыня прафкома фізкультурна-аздараўленчага комплексу «Здароўе» Фрунзенскага раёна Мінска Д. Скруць. Ён спасылаўся на прыватызацыю комплексу, дзе працуе, — яна праведзена, на яго думку, несправядліва. Дарэчы, Д. Скруць, іншыя скардзіліся на пасіўную пазіцыю ў гэтых пытаннях прававохоўных органаў.

— Павінен існаваць прававы механізм пераходу прадпрыемства з аднаго стану ўласнасці ў другі, — зазначыў выступаючы. — Пры гэтым на дзяржаўным узроўні павінна гарантавацца прававая абароненасць кожнага, хто стаў на шлях прыватызацыі.

— Мы жывём у грамадстве, якое трэба рашуча перабудоўваць, — зазначыў у заключэнне сустрэчы С. Шушкевіч. — І цяжкасці тут непазбежныя. Зараз кіраўніцтва шукае розныя падыходы да вырашэння набалелых праблем. У гэтым годзе мы прымем сапраўды дэмакратычную Канстытуцыю, дэмакратычны закон аб выбарах, якія, безумоўна, дапамогуць зняць многія балючыя пытанні ў нашым грамадстве. І зараз нам вельмі патрэбна ўзаемаразуменне. Я задаволены сустрэчай, мне імпануе ваша пазіцыя, давайце будзем шукаць выйсце разам.

Людміла КЛАСКОЎСКАЯ.

ЭКСПРЭС-ДАЙДЖЭСТ

КРАСНАПОЛЛЕ. Яшчэ зусім нядаўна ў спіс гаспадарак, якія падлягаюць адсяленню, уваходзіў і саўгас «Палужскі». Некалькі вёсак саўгаса былі поўнасцю адселены яшчэ ў мінулым годзе. Зусім нядаўна ў саўгасе адбыўся сход, на якім планавалася вырашыць многія пытанні перасялення. Аднак удзельнікі сходу не падтрымалі рашэння аб адсяленні. «Тут жылі нашы бацькі, жывём мы, тут жа нашы дзеці, і таму мы не за адсяленне, тут жыць і працаваць будзем»,—такое рашэнне было вынесена на сходзе.

«Голас Краснапольшчыны» (Краснапольскі раён).

СЛОНІМ. Дэфіцыт і падаражанне тавараў адгукнуліся крымінальным рэхам. Цяпер зладзеі нічым не грэбуюць. З памяшкання «Міжрайгаза» раптоўна зніклі цюлевыя шторы і электраручнік.

«Слонімскі вестнік» (Слонімскі раён).

ЗНАЁМЦЕСЯ: НОВАЯ КАМПЕНСАЦЫЙНАЯ ВЫПЛАТА ЗА МЯСА

Павышэнне цэн на мяса і масла шакіравала многіх. Але не ўсе ведаюць, што ўрад Беларусі прадугледзеў у сувязі з гэтым новую кампенсацыйную выплату. Пра яе карэспандэнту «Звязды» расказвае намеснік міністра фінансаў Рэспублікі Беларусь Мікалай КОРБУТ.

— Яшчэ 20 снежня мінулага года Савет Міністраў рэспублікі прыняў пастанову № 482 «Аб мерах па забеспячэнню сацыяльнай абароны насельніцтва ва ўмовах лібералізацыі цэн». У ёй, у прыватнасці, запісана, што з мэтай частковай кампенсацыі дадатковых расходаў, выкліканых змяненнямі рознічных цэн на мяса і масла, жыхарам рэспублікі з бюджэтных сродкаў робіцца выплата з разліку 720 рублёў на год. Зазначу, што больш за 70 працэнтаў гэтай сумы складае частковая кампенсацыя за павышэнне цэн на мяса.

Дадатковыя выплаты ажыццяўляюцца пачынаючы з лютага — па 60 рублёў у месяц у выглядзе даплат да зарплаты, дэнсій, стыпендый, дапамогі па беспрацоўю па асобнай ведамасці па месцы іх атрымання. Выплаты на дзяцей робяцца па месцы асноўнай работы або вучобы маці (калі маці не працуе, то бацькі ці асобы, якая іх замяняе). У іншых выпадках кампенсацыю атрымліваюць у органах сацыяльнага забеспячэння або органах народнай адукацыі па месцы пражывання бацькоў з дзецьмі.

Пенсіянер, што прадаўжае працаваць, і асобы, якія працуюць у некалькіх месцах, атрымліваюць 60 рублёў па месцы асноўнай работы. І зусім не робяцца выплаты асобам (у тым ліку і дзецям), якія знаходзяцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні.

Хачу засяродзіць увагу вось на чым. Выплаты непрацуючым пенсіянерам у памеры 120 рублёў, якія зроблены ў студзені, былі ажыццёўлены з мэтай сацыяльнай падтрымкі гэтай катэгорыі насельніцтва як папераджальныя за люты — сакавік.

ЦЭНЫ НА РЫНКАХ

ВІЛЬНЮС. Бульба (1 кг) — 5—6, морква — 10—12, буракі — 7—8, цыбуля — 35—40, свініна — 100—140, ялавічына 100—120, куры — 70, яйкі — 20, смятана — 60—70, тварог — 40—50, яблыкі — 25—30 рублёў.

РЫГА. Бульба — 8—9, морква — 5—10, буракі — 5—6, цыбуля — 15, свініна — 70—180, ялавічына — 60—120, куры—80—100, яйкі—14—20, масла — 130—200, смятана — 90—100, тварог—40, малако — 12, яблыкі — 40—60 рублёў.

МАСКВА. Бульба — 10—30, морква — 15—20, буракі — 15, цыбуля — 40—50, свініна — 150—200, ялавічына — 150—200, куры — 100, яйкі — 30, смятана — 60—70, тварог — 60—70, малако — 50, яблыкі — 25—50 рублёў.

МІНСК. Бульба — 5—7, морква — 5, свініна — 70—100, буракі — 5, куры — 60, яйкі — 15, масла — 100, смятана — 80, тварог — 30—40, яблыкі — 45—60 рублёў.

На Камароўскім рынку курс купона знізіўся да 0,5—0,4 рубля.

«Агенцтва РІД».

ПІНСК—РАЗАНЬ: СУПРАЦОЎНІЦТВА ПРАДАЎЖАЕЦЦА

Калектыў інстытута «Палессегіправодгас» ужо 20 гадоў аказвае дапамогу сельскім працаўнікам Расіі. Сярод усеагульнага хаосу гэтая нітачка, якая звязвае прадпрыемствы дзвюх рэспублік, трымаецца пакуль моцна.

Зараз ідзе работа над праектам аднаго з самых буйных за апошні час аб'ектаў. Гэта — новы саўгас «Смалеейскі» на Разанішчыне. Аб маштабах будучай гаспадаркі гаворыць тое, што будаўнікам тут трэба будзе асвоіць 180 мільёнаў рублёў укладанняў. У праекце—жывёлагадоўчыя комплексы на 24 тыс. свіней, 1.300 кароў, 1.000 адкормачнікаў, кармацэхі, іншыя вытворчыя пабудовы.

ВНУ БЕЛАРУСІ. ЧАКАЕЦЦА «ЎЦЕЧКА МАЗГОЎ»

Ужо а палове адзінаццатай ля галоўнага корпуса БДУ пачаў пацiху збірацца народ. Студэнты з павязкамі дружыннікаў на рукавах, супрацоўнікі ВНУ асобнымі купкамі стаялі на пляцоўцы перад будынкам і нешта абмяркоўвалі.

— Вось пачнецца мітынг у адзінаццаць, тады і даведаемся, аб чым будзе гаворка, — так на маё пытанне, што прывяло іх сюды, адказалі супрацоўнікі універсітэта. — Ведаем дакладна, што размова будзе ісці аб сацыяльных праблемах.

Студэнты, якія прыйшлі сюды з заняткаў па фізкультуры, як я зразумеў, павінны былі забяспечыць парадак; каму стане дрэнна — адвесці ў медпункт, калі спатрэбіцца сур'ёзная медыцынская дапамога — выклікаць «хуткую дапамогу». Увогуле, арганізатары, атрымаўшы дазвол гарвыканкома на правядзенне агульнагарадскога мітынгу выкладчыкаў ВНУ, вырашылі наладзіць яго на высокім узроўні.

— Самае галоўнае патрабаванне, — сказаў Анатоль Васільевіч Паўлаў, старшыня прафкома супрацоўнікаў БДУ, у інтэрв'ю перад пачаткам мітынгу, — увядзенне закона аб народнай адукацыі ў поўным аб'ёме з 1992 года. Два асноўныя артыкулы — 34 і 37, якія датычацца фінансавання і заработнай платы, нашым парламентам перанесены на ўвядзенне аж з 1 студзеня 1994 года. Мы ж за гэтыя два гады страцім лепшых сваіх людзей. Ад нас ужо пачалі разбягацца таленавітыя выкладчыкі, лепшыя студэнты. Тры студэнты з факультэта радыёфізікі, якія былі пасланы на стажыроўку ў Германію, падпісалі там кантракты і засталіся. І я іх не асуджаю: у той бязглуздзіцы, якая зараз назіраецца ў нашым грамадстве, гэта лепшае выйсце. Хай лепш яны прыняясуць нейкую карысць сусветнай супольнасці, чым будуць пакутаваць разам з намі. З другога боку, «уцечка мазгоў» прывядзе да таго, што мы апамятаемся, але тады трэба будзе затраціць значна больш сродкаў, чым зараз.

— Студэнтам не ўсё роўна, якім будзе стан выкладчыкаў,— ля мікрафона Адам Кішкевіч, старшыня студэнцкага прафкома БДУ. — І таму яны выказваюць сваю падтрымку патрабаванням супрацоўнікаў ВНУ. Адно наведванне сталовай каштуе 15 рублёў, а стыпендыя плюс кампенсацыя складаюць толькі 450 рублёў. Такім чынам, чым больш студэнты будуць думаць аб тым, як зарабіць грошы на хлеб, тым менш якаснымі будуць іх веды. Мы падтрымаем студэнтаў, а яны ў сваю чаргу падтрымаюць выкладчыкаў.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Новае ў купоннай сістэме

На чарговым пасяджэнні Камісіі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь па каардынацыі работы і аператыўнаму вырашэнню пытанняў, звязаных з функцыяніраваннем купоннай сістэмы разлікаў за тавары, унесены рад змяненняў і дапаўненняў у інструкцыю, якая рэгламентуе парадак выдачы, захоўвання, уліку картачак спажыўца і рэалізацыі тавараў па купонах.

I. РАСТЛУМАЧЭННІ

1. У якім размеры павінны выдаць купоны жыхару рэспублікі, які атрымлівае перавод з камандзіровачнымі расходамі ў аддзяленні сувязі?

— У размеры 60 працэнтаў ад сумы пераводу.

2. У якім размеры забяспечваецца купонамі выплата кампенсацыі рэабілітаваным грамадзянам?

— Кампенсацыі, якія выплачваюцца рэабілітаваным грамадзянам або іх наследнікам, забяспечваюцца купонамі па месцы іх атрымання ў поўным размеры, але не больш чым на 2,5 тысячы рублёў.

3. Дзе павінен атрымліваць купоны студэнт, школьнік, навучэнец тэхнікума, калі ён вучыцца і працуе?

— Па месцы работы ў размеры 60 працэнтаў ад заработку, па месцы вучобы — 100 працэнтаў стыпендыі.

4. Ці трэба забіраць купоны прадпрыемству, якое рэалізуе індывідуальным забудоўшчыкам сценавыя, дахавыя і пілалесаматэрыялы?

— Не. Пры наяўнасці адпаведных дакументаў аб выдзяленні ўчастка для будаўніцтва індывідуальнага жылога дома продаж вышэйуказаных тавараў грамадзянам рэспублікі ажыццяўляецца без забірання купонаў. Пры гэтым заява грамадзяніна з указаннем дакументаў, на падставе якіх праведзены льготны продаж, захоўваецца ў бухгалтэрыі прадпрыемства.

5. Ці выключаюцца пры разліку сумы купонаў з даходаў сумы пералічэнняў ва ўклад, на пагашэнне пазык, адлічэнняў органам страхавання?

— Не. Пры вызначэнні сумы купонаў да выдачы з агульнай сумы даходаў вылічваюцца толькі сумы падаткаў, адлічэнняў у Пенсіённы фонд, аліментаў і прафсаюзных узносаў (калі ўзносы пералічаны ў безнаяўным парадку).

6. Ці далучаюцца да сумы заработнай платы пры разліку купонаў кампенсацыя за водпуск, выхадная дапамога па скарачэнню штатаў і г. д.?

— Так. Сума купонаў да выдачы працуючым вылічаецца зыходзячы з усіх сум даходаў, атрымліваемых па месцы работы, г. зн.:

— заработнай платы, прэмій, дапамог, ганараараў;

— дапамогі і кампенсацый (акрамя камандзіровачных расходаў).

7. Ці далучаецца да заработнай платы сума дапамогі на дзяцей пры разліку купонаў і ці абмяжоўваецца іх выдача 2.500 руб.?

— Не. Усе дапамогі, надбаўкі і выплаты на дзяцей забяспечваюцца купонамі па месцы іх атрымання ў размеры 100 працэнтаў. Да заработнай платы яны не далучаюцца і верхняя граніца абмежаванняў па выплаце купонаў (2,5 тыс. рублёў) на іх не распаўсюджваецца.

8. З якога даходу выдаваць купоны работнікам прадпрыемстваў, якія ўзялі водпуск без аплаты ў сувязі з вытворчай неабходнасцю (адсутнасцю сыравіны, дагавораў і г. д.)?

— У разлік прымаецца заработак за папярэдні месяц, калі работнік атрымліваў поўную аплату.

9. Як разлічваецца сума купонаў пры выплаце грошай на набыццё адзення, абутку і г. д. для дзяцей-сірот?

— Студэнтам вышэйшых і навучэнцам сярэдніх спецыяльных і прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, залічаных на поўнае дзяржаўнае забеспячэнне, сумы, што выдаюцца на адзенне, абутак, мяккі інвентар у адпаведнасці з зацверджанымі нормамі, адначасова забяспечваюцца купонамі з выдачай грошай у поўным размеры без дзяцення на месяцах.

II. ДАПАЎНЕННІ

1. Замежныя грамадзяне, а таксама грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія працуюць па кантрактах за мяжой (пры дакументальным пацвярджэнні), а таксама якія маюць пастаяннае месца пражывання за мяжой, пры абмене за ўстановах банкаў свабодна канверсуемай валюты на рублі па ўстаноўленаму курсу маюць права адначасова атрымаць купоны ў размеры 100 працэнтаў ад сумы абмену, але не больш як 2.500 рублёў у месяц.

2. Выплата частковай кампенсацыі, выкліканая змяненнем рознічных цэн на мяса і масла (720 рублёў у год на кожнага жыхара рэспублікі), забяспечваецца купонамі штомесячна ў поўным размеры (60 рублёў) па месцы яе атрымання.

3. Выканкомам мясцовых Саветаў і банкам дазваляецца, у парадку выключэння, па заяве фермера або грамадзяніна, які займаецца прадпрымальніцкай дзейнасцю і зарэгістраваны ва ўстаноўленым парадку, пры часовай адсутнасці даходаў выдаваць купоны з разліку 350 рублёў у месяц на 1 чалавека (або, па рашэнню камісіі выканкома, зыходзячы з сярэдняга заработку рабочых сельгаспрадпрыемстваў раёна за мінулы месяц).

Пры наяўнасці даходу ў фермерскіх гаспадарак асновай разліку для выдачы купонаў з'яўляюцца сродкі, што накіроўваюцца на аплату працы.

4. Прадаставіць права аблвыканкомам, Мінскаму гарвыканкому, зыходзячы з мясцовых умоў, вызначаць парадак рэалізацыі з частковым, але абавязковым забіраннем купонаў, наступных тавараў:

не вырабляемых у рэспубліцы і закупленых у дэцэнтралізаваным парадку на біржах, аўкцыёнах (у кожным канкрэтным выпадку па прадстаўленнях гандлёвых прадпрыемстваў з адпаведнымі абгрунтаваннямі);

харчовых тавараў з тэрмінам рэалізацыі да 1 месяца (уключаючы паўфабрыкаты з натуральнага мяса і птушкі, вырабляемыя на прадпрыемствах грамадскага харчавання) — пры ўмове пастаяннай наяўнасці на працягу рабочага дня ў гандлёвых прадпрыемствах, а таксама з улікам поўнага забеспячэння патрэбнасці насельніцтва ў гэтым відзе прадукцыі ў цэлым па рэтыёне.

5. Унесці змяненні ў пункт 7.2. другога раздзела Інструкцыі ў частцы павелічэння з 700 да 1.500 рублёў памеру бескупоннага продажу харчовых тавараў (без уліку алкагольных напіткаў), прызначаных для пахавання.

***

Рэспубліканская камісія рэкамендуе аблвыканкомам і Мінскаму гарвыканкому пры дапамозе прыцягнення работнікаў упраўленняў унутраных спраў, банкаў, фінансавых органаў, гандлёвых інспекцый, упраўленняў гандлю, аблспажыўсаюзаў і грамадскасці правесці ў лютым гэтага года масавыя праверкі на прадпрыемствах, ва ўстановах, арганізацыях і ў гандлёвай сетцы правільнасці прымянення інструкцыі «Аб парадку выдачы, захоўвання, уліку картачак спажыўца і рэалізацыі тавараў па купонах» і дапаўненняў да яе і прыняць неабходныя меры па ліквідацыі наяўных недахопаў. Аб выніках прадставіць камісіі кароткую інфармацыю і магчымыя прапановы па далейшаму ўдасканаленню купоннай сістэмы разлікаў за тавары.

ПАРАДЫ ЧЫТАЧОЎ

Лыжы плюс кемлівасць

І ўсё-такі ў нас іншы раз выпадае вольны час. Калі вам здаецца, што яго зусім няма, пастарайцеся распланаваць свой выхадны так, каб у вас засталося хоць бы 2 — 3 гадзіны на лыжную прагулку. Схадзіце ў зімовы лес дзеля велізарнага зараду станоўчых эмоцый, якіх нам цяпер так не стае.

Калі вам прыйдзецца ехаць з лыжамі ў транспарце, замест неэстэтычнага мяшка, надзетага на вострыя канцы палак, скарыстайце гумавую трубку падыходзячага дыяметра. Штыры палак таксама стануць бяспечнымі, калі ў якасці чахла на іх выкарыстаць коркі з-пад шампанскага.

Дапусцім, вы любіце катацца з гор. Вам, канешне, добра вядома, які бывае цяжкі шлях угору. Каб яго аблегчыць, прывяжыце да лыжаў дзве палоскі з палатна або парусіны, і вы пераканаецеся, што пад'ём нават на крутыя схілы не запатрабуе хадзьбы «ёлачкай». Улічыце, што даўжыня палоскі павінна быць роўнай усёй ніжняй паверхні лыжы, а яе шырыня ледзь вузейшая за шырыню лыжы.

Адпраўляючыся ў лес, захапіце з сабой ізаляцыйную стужку. Яна спатрэбіцца вам на выпадак паломкі лыжы. Пры дапамозе дзвюх палачак (галінак), накладзеных на пералом па прынцыпу шыны, і ізаляцыйнай стужкі вы лёгка справіцеся з рамонтам. «Перабінтаваная» такім чынам лыжа добра слізгае пры спакойнай роўнай хадзьбе.

А як вы захоўваеце лыжы? Вельмі зручнай і арыгінальнай вешалкай для лыжаў можа стаць кавалак гумы, выразанай са старой аўтапакрышкі. Для гэтага трэба выразаць папярочную палоску шырынёй 15 — 20 сантыметраў. Рыфленую частку былой аўтапакрышкі прыбіце да сцяны. Пры гэтым яе бакавыя часткі будуць надзейна трымаць у сваіх «гумавых абдымках» моцна звязаныя лыжы.

ПАРАДЫ НА ЎСЯКІ ВЫПАДАК

Што рабіць з рыбай

*** Амаль усе сарты марской рыбы можна адварваць.** Але каб яна атрымалася смачнай, трэба захоўваць наступныя правілы. Па-першае, адварваць рыбу ў адкрытай эмаліраванай пасудзіне. Па-другое, трэба спалучаць тлустыя і нятлустыя сарты рыбы, напрыклад, траску і палтус, масленую рыбу і путасу, сонечнік і луфар. Вазьміце рыбу двух сартоў (па паўкілаграма кожнай) і адварыце ў 1,5 л вады (не больш!). Для гэтага закіпяціце ваду, дабаўце лыжку солі, пакладзіце дробна нарэзаную цыбулю і моркву, пяць гарошын чорнага перцу, тры лаўровыя лісткі, кроп і пятрушку. Дайце пракіпець 5 мінут, затым апусціце ў ваду рыбу, ачышчаную і нарэзаную на кавалкі таўшчынёй 3 см. Рыба павінна варыцца 7 хвілін (не больш).

*** Можна варыць рыбу ў агурочным расоле,** а на атрыманым булёне гатаваць расольнік або салянку.

*** Варыць рыбу трэба невялікімі партыямі** і ў неглыбокай пасудзіне, тады яна не будзе крышыцца.

*** Не варыце рыбу на моцным агні:** яна робіцца жорсткай, а булён мутным. Цэлую рыбу адварваюць у залежнасці ад яе велічыні 15—30 мінут, прычым пры адварванні яе трэба пасаліць некалькі больш, чым пры варцы мяса і іншых прадуктаў. А каб яна захавала форму, перавяжыце яе шпагатам і пакладзіце брухам уніз.

*** Каб палепшыць смак прыпушчанай камбалы, шчупака, траскі,** рэкамендуецца дадаць у вадкасць маянэз (5—10 працэнтаў ад масы рыбы), а атрыманы булён выкарыстаць для прыгатавання соусу.

КУХНЯ РОЗНЫХ НАРОДАЎ

Піца

Піца — гэта своеасаблівы пірог. У рускім варыянце ўяўляе сабой адкрыты пірог з усялякімі начынкамі. Дык што ж такое піца? Дзе з'явілася? І хто яе вынайшаў?

Рымскі палітычны дзеяч і палкаводзец Лукул Луцый Ліцыній (106—65 гг. да н. э.), вядомы сваімі ваеннымі подзвігамі, у асяроддзі сяброў наладжваў пагулянкі, якімі праславіўся больш, чым сваімі ваеннымі поспехамі. Многія кулінарныя шэдэўры, якія ўпрыгожвалі сталы Лукула і якія ўвайшлі ў лепшыя кулінарныя кнігі, сталі вядомыя і нам. Гэта, напрыклад, піца, «а ля напалетана»— залаціста-жоўты пірог з кіслага цеста, спечаны на драўнінным вуголлі.

Выпякаюць піцу з дражджавога, слаёнага, прэснага цеста. Для начынкі прыдатныя вяндліна, сасіскі, сардэлькі, звараныя ўкрутую яйкі, сыр, грыбы (часцей шампіньёны), памідоры, салодкі балгарскі перац, рэдчатая цыбуля: цыбуля-парэй, маладыя кабачкі дыяметрам не больш 2 см, такія ж баклажаны, стручкі маладой фасолі, свежая морква, нарэзаная вузкімі доўгімі (3—4 см) брусочкамі, масліны, аліўкі, маянэз, тамат-паста, зяленіва кропу, пятрушкі, сельдэрэю. Важнай вартасцю піцы з'яўляецца тое, што на яе выраб не трэба вялікіх затрат працы і часу. Гэта, можна сказаць, экспрэс-блюда. Пры гэтым піцу ахвотна ядуць і дарослыя, і дзеці. Яе падаюць на снеданне, і на абед, і на вячэру, да кавы або чаю. Як і пірог, піцу зручна ўзяць у дарогу, у лес, на рыбалку.

ПАРАДЫ ДАЧНІКАМ

Спосаб атрымаць раннія кветкі і гародніну

Добрую зямлю кладуць у шкарлупіну ад яек, у ніжняй частцы якой робяць дзірку, каб лішняя вада магла выцякаць. У кожную шкарлупінку садзяць насенне і захоўваюць у пакоі ці ў парніку, паліваючы часта, але не многа. Калі не будзе начных маразоў, то раслінкі перамяшчаюць у адкрыты грунт, але перад тым як пасадзіць — шкарлупінкі расціскаюць, каб карані маглі свабодна расці ўглыб і ўшыркі. Гэты спосаб добры для агуркоў, дынь, цукровага гарошку і г. д.

Алоэ супраць шкоднікаў

Алоэ дзейнічае на насякомых, мурашак і чарвякоў як яд: 1/12 лот. алоэ раствараюць у 1 кварце (1 кварта — 250 г) вады. Растворам можна апырскваць ці змазваць пры дапамозе пэндзля расліны, можна таксама купаць у ім ці націраць ім жывёлін. Алоэ дзейнічае на насякомых хутка і пэўна, таму ім добра апырскваць падлогу, краты, шпалеры для кветак і раслін, гэтак жа, як і садовыя градкі, каб абараніць іх ад розных чарвякоў і смаўжоў.

Аб угнаеннях

*** Лакрычны корань** ужываюць для ўмацавання старых раслін, пладовых дрэў. Яго кладуць у тых месцах, дзе знаходзяцца маладыя карані, і засыпаюць зямлёй.

*** Вулічнае смецце** — дзейнічае вельмі па-рознаму. Смецце з тых вуліц, дзе жывуць мяснікі, значна лепшае, чым з тых вуліц, куды трапляе мала жывёльных рэшткаў. Яго можна выкарыстоўваць, калі яно праляжала некалькі месяцаў.

*** Памёт** — прыгодны для садовых градак, калі паўгода праляжаў у кучы. На другі ж год прыгодны і для пяшчотных раслін і кветак, але ў малой колькасці. Курыны ж вельмі добры для агуркоў, але ні курыны, ні галубіны, ні індычы не прыгодны для сухой пясчанай глебы, таму што яе нельга заўсёды ўтрымліваць вільготнай.

*** Касцяная мука** — раскладаецца марудна і калі не вельмі дробная, то аказвае дзеянне толькі ў наступным годзе, таму зямлю лепш змешваць з ёю за 6 месяцаў да ўгнаення.

«Кніга для ўсіх сялоўяў», 1866 год.

Родная мова, гісторыя, культура — неад'емная частка нашага самаўсведамлення

БЕЛАРУШЧЫНА

З АЛОЎКАМ — ПА СЛОЎНІКАХ

Сваё мілей, чым пазычанае

УСЕ МЫ ў большай або меншай ступені людзі двухмоўныя. Але, пэўна, ніхто іншы, як журналіст, не зведвае такіх цяжкасцей, калі мова яго мыслення і рабочая мова не супадаюць. «Ліха бяда пачатак...» «Чакаць з мора надвор'я»... «Сяброўства сяброўствам, а тытунёк—паасобку»... Так у нас пісалі і пішуць, гаварылі і гавораць. Тут сказ'аўся як недахоп моўнай культуры і адукацыі, так і нястача вельмі неабходных двухмоўных даведнікаў па фразеалогіі. Незабыўная зорка нашай філалогіі — Фёдар Янкоўскі даўно казаў аб такой патрэбе, назапашваў багацейшы матэрыял... Справа яго і яго папярэднікаў атрымала працяг. У канцы мінулага года, адзін за адным, з'явіліся адразу два слоўнікі:

● **И. Киселев. Русско-белорусский фразеологический словарь [Выдавецтва «Народная асвета»].**

◆ **З. Санько. Малы рускабеларускі слоўнік прыказак, прымавак і фразем [Выдавецтва «Навука і тэхніка»].**

Укладальнік першага даведніка сістэматызуе ў асноўным *агульны* фразеалагічны матэрыял, вядомы рускай, беларускай ды іншым славянскім мовам. Многія выразы тыпу *збіцца з ног, зводзіць канцы з канцамі, куры не клююць* мы звычайна беспамылкова ўжываем у аднолькавых сітуацыях. А вось, скажам, ужо выраз *курам на смех* можа зблытаць нашага двухмоўнага чалавека. Тут і робіць слоўнік сваю карысную паслугу, звяртаючы нашу ўвагу на тое, што па-руску правільна будзе казаць «кýрам нá смех», па-беларуску — «кура́м на сме́х»; па-руску «идти по пятáм», па-беларуску — «па пя́тах».

Зразумела, слоўнік ілюструе і больш адметныя адрозненні. Вось некалькі ўдала скампанаваных фразеалагічных пар: *с гулькин нос — з камарóў нос, і голаму за пазуху; ни на йоту — ні на каліва; в долгий ящик — да святога нігды; паче чаяния — чаго добрага; как кур во щи — як лісіца ў саладуху.*

Разам з тым трапляюць у матэрыял слоўніка несамавітыя калькі тыпу *битый час — бітая гадзіна; ум за разум заходит — розум за розум заходзіць* і інш. Сумніцельна, што яны могуць успрымацца як натуральныя ў нашай мове. Аўтар нават не знаходзіць ім адпаведных літаратурных ілюстрацый.

Дарэчы, пра ілюстрацыі. З-за недахопу часу ці па якой іншай прычыне І. Кіселёў у гэтай частцы зрабіў свой слоўнік яўна нераўнацэнным. Калі кожны рускі фразеалагізм абавязкова ілюструецца яркім прыкладам з-пад пяра класікаў, то іх беларускія адпаведнікі — нярэдка сказамі ўласнай канструкцыі, якія нагадваюць панылае практыкаванне з падручніка. Параўнаем: *Во дни веселий и желаний я был от балов без ума* (А. Пушкин) і: *Вучні былі без памяці ад свайго класнага кіраўніка...*

Уявім успрыняцце таго ж вучня сярэдняй школы, якому адрасаваны гэты дапаможнік. Вялікая колькасць аналагічнага плюс другаснасць («шчарбасць») беларускай ілюстрацыйнай часткі — гэтага можа быць дастаткова, каб выклікаць у нясталых носьбітаў роднай мовы нечаканае (і незапраграмаванае аўтарам) расчараванне...

У гэтым сэнсе слоўнік, укладзены Зміцерам Санько, свядома «выпукляе» адметнасць, раскошу, нацыянальную вобразнасць беларускай фразеалогіі. Ён не абмежаваўся толькі фраземамі (фразема — гэта кароткі ўстойлівы выраз, прыклады якіх разглядаліся вышэй), а прапанаваў чытачу даволі шырокі спіс адпаведных рускіх і беларускіх прыказак і прымавак. Матэрыял карпатліва збіраўся аўтарам у працах нашых вядомых фалькларыстаў М. Федароўскага, І. Насовіча, А. Сержпутоўскага, Е. Раманава, П. Шпілеўскага, Ф. Янкоўскага і іншых, запісваўся ад бацькоў. Да кожнага рускага выразу падаецца ад двух да шасці-васьмі беларускіх адпаведнікаў: чытач сапраўды раскашуе!

Праўда, тут можна заўважыць адваротны перакос: некаторыя недакладнасці ў падачы рускага матэрыялу (напрыклад, у слоўніку: *Ни швец, ни жнец, ни в дуду игрец* замест традыцыйнага рускага выразу: *И швец, и жнец, и в дуду игрец*). Часам аўтар скарыстоўвае ў слоўнікавых артыкулах зусім аддаленыя па сэнсу выразы. Вядома, што ў выпадку, калі рускія кажуць *спать без задних ног*, беларусы падкепліваюць: *як пшаніцу прадаўшы.* З. Санько разам з гэтым дае яшчэ адзін адпаведнік фразеалагізму *без задних ног — як астатняе ў печ усыпаўшы.* Магчыма, апошняе ўсё ж азначае не «спаць», а «гараваць»?

Залішняй самабытнасцю, на нашу думку, выглядае замена крылатага выразу *«Жив Курилка!»* з дакладна азначаным сэнсам на беларускія прыказкі тыпу *Жыве наш тата і без свята, Нашто той вох, калі мы ўтрох (?).*

Пры ўсіх заўвагах (на якія, пэўна, і спадзяваліся аўтары) — абедзве іх работы прыйшліся вельмі актуальнымі і карысными. Раім чытачам у гэтым пераканацца.

Для таго, хто вымушаны эканоміць на кнігарнях, прапануем маленькі слоўнічак-выняткy: ЗАЛАЦІНКІ З ФАЛЬКЛОРНЫХ КРЫНІЦ, САБРАНЫЯ ЗМІЦЕРАМ САНЬКО.

Бедность не порок — Сярмяга не знявага, а жупан — не вялікі пан.

Бог видит, кто кого обидит — Бог не цяля, бачыць круцяля.

В ногах правды нет — Сядзь, няхай полы не вісяць — Ногі для дарогі.

В огороде бузина, а в Киеве дядька — Гэты пра воз, а той пра коз — Хто пра хату, а хто пра лапату — Я яму пра абразы, а ён мне пра гарбузы

Гора родила мышь — З вялікае хмары малы дождж

Делу — время, потехе — час — Перш папрацуй, а тады й патанцуй — Была нядзеля — і мы дудзелі, цяпер серада — працуй, грамада — Гульня, ды не штодня

Десятая (седьмая) вода на киселе — На адным сонцы апучы сушылі — Стрэчнай бабкі родны Хведар.

Дешево и сердито — Хітра, мудра, невялікім коштам.

Долг платежом красен — Што вінен, аддаць павінен — Прыйшоў з мехам, не адбудзеш смехам — Круці не круці, а што трэба заплаці — Пазычай, як умееш, аддавай — хораша.

Дорога ложка к обеду — Дарогае яечка да Вялікадня — Дождж у пару, што золата.

И мы не лыком шиты — І мая доля не шчарбатая — І мой квасок не з трасок — І мы не з гліны злепленыя — Або мой грош дзіравы?

Копейка рубль бережет — Зерне да зерня, будзе поўная мерня — Колас да коласа — снап будзе — Рубель з граша паходзіць

Калі вас, шаноўныя чытачы, зацікавіць гэта публікацыя, мы працягнем яе ў наступным выпуску.

ВЫСТАЎКІ

Знаёмы цень, абрыс цудоўны

Хто з нас не рабіў выцінанкі? Многім гэтае слова можа здацца незнаёмым, але варта прыгадаць, як у дзяцінстве мы выразалі з паперы снежынкі і ўпрыгожвалі імі навагоднюю ёлку, клеілі іх на шыбы. Так што ўсе мы знаёмыя з гэтым старажытным відам народнай творчасці.

Сёння ў Рэспубліканскай мастацкай галерэі Саюза мастакоў Беларусі можна ўбачыць вялікую калекцыю выцінанак, зробленых як прафесіянальнымі мастакамі, так і самадзейнымі майстрамі народнай творчасці. Тут дэманструюцца суразткі з калекцыі Я. Сахуты, якія выразалі ў нашых вёсках яшчэ ў канцы мінулага стагоддзя (час росквіту гэтага мастацтва), побач з імі выцінанкі сучасныя. Прыгожымі карункамі, выразанымі з каляровай паперы, сённяшнія мастакі ўпрыгожваюць інтэр'еры, афармляюць кнігі, плакаты.

Л. САЛОДКІНА.

НА ЗДЫМКАХ: «Прысвячэнне Ф. Скарыне». Н. Сакалова-Кубай, Г. Сакалоў-Кубай; «Галубы». Т. Маркавец.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Вы прасілі дапамогі

Ветэран вайны і працы М. Ляхавец з г. п. Лельчыцы ў сваім пісьме ў рэдакцыю моцна абураўся безгаспадарчасцю на фермах калгаса «На варце» і патрабаваў навесці там парадак.

«Сапраўды, — пацвярджае намеснік старшыні Гомельскага абласнога камітэта па сельскай гаспадарцы і прадуктах харчавання С. КАРОЛЬ, — у 1991 годзе ў калгасе «На варце» было дапушчана падзенне маладняку буйной рагатай жывёлы.

Гаспадарка закупіла 572 галавы маладняку ў насельніцтва Украіны, а ўмоў для нармальнага іх утрымання не стварылі. Гэта пытанне разглядалася на пасяджэнні праўлення калгаса і ва ўпраўленні сельскай гаспадаркі і прадуктаў харчавання райвыканкома. Рашэннем праўлення калгаса з вінаватых спагнаны страты ад паморку на суму 2.321 рубель.

Паведамляецца таксама аб тым, што прыняты меры па недапушчэнню паморку ў далейшым. Цяпер такіх фактаў у ходзе зімоўкі на фермах гаспадаркі няма.

***

«Я выпісваю «Звязду» і нашу «раёнку», але своечасова іх не атрымліваю. Карацей кажучы, носяць нам не свежыя газеты, а макулатуру, за якую цяпер і плаціць трэба нямала, бо папера ў дэфіцыце»,—скардзілася пенсіянерка з в. Татарка Воранаўскага раёна Я. Грыгілевіч.

Як піша Яніна Адамаўна, паштальён (муж загадчыцы аддзялення сувязі Даўгялы) не хоча насіць не толькі газеты і часопісы, а нават пісьмы. І яна заканамерна пытаецца: калі скончыцца гэта «невясёлая песня?»

Начальнік Воранаўскага раённага вузла сувязі В. САВІЧ прызнаў, што ў выніку праверкі прыведзеныя факты пацвердзіліся. Высветлілася таксама, што на 1992 год Я. Грыгілевіч у аддзяленні сувязі Даўгялы газеты не выпісвала, а атрымлівае іх у Пагародка. Цяпер вырашаецца пытанне аб перадачы даставачнага ўчастка, дзе жыве падпісчыца, гэтаму аддзяленню сувязі. А за нясвоечасовую дастаўку пошты і карэспандэнцыі начальніку а/с Даўгялы А. Эйсмант аб'яўлена вымова, і яна будзе пазбаўлена прагрэсіўнай аплаты.

ВОДГУК-УСПАМІН

Адна бабка сказала...

З выпадку апублікавання артыкула А. Каўкі «Як загінуў Янка Купала!» у «Звяздзе» 30 лістапада 1991 года

Аўтар артыкула Аляксей Каўка вырашыў унесці некаторую яснасць у пытанне аб тым, як загінуў Янка Купала. Для гэтага ён выкарыстаў успаміны дзвюх жанчын — Алімпы Свяневіч і яе знаёмай, нейкай «пані Ч.». Абедзве яны, як сведчыць А. Каўка, добра ведалі жонку Я. Купалы — Уладзіславу Францаўну Луцэвіч. А іх успаміны, як мы даведаліся, гэта вынік іх сустрэч і размоў з ёю.

У пачатку артыкула аўтар заяўляе, што ў гэтых успамінах ёсць «нечаканыя дэталі да згаданай версіі» (пра тое, як загінуў паэт. — **У. Н.**).

Скажам адразу, што «нечаканых дэталей» у гэтых успамінах нямала, але ўсе яны нішто іншае, як плёткі адной цёткі.

А. Каўка цытуе ўспаміны А. Свяневіч у перакладзе з польскай. Яны маюць назву — «Жменя звестак пра Янку Купалу, сабраных ад людзей, якіх я ведала асабіста». Канкрэтней — размова тут ідзе пра тое, як і што яна ў 1945 годзе даведалася ці пачула пра трагічны лёс Я. Купалы ад пані Ч., а тая, у сваю чаргу, з вуснаў «найбліжэйшай сяброўкі Уладзі». Прычым перадача звестак аўтару ўспамінаў адбылася ў Мінску, у час выпадковай сустрэчы А. Свяневіч з Ч., калі апошняя сказала: «Пайду з паняю на базар, па дарозе многа раскажу».

Тое, што расказала гэтая таямнічая пані Ч., — суцэльная блытаніна фактаў.

Першая недакладнасць: «Купала разам з жонкаю пасля ўцёкаў з Мінска ад нямецкае акупацыі жыў у Горкім». На самай жа справе ён жыў пад Казанню ў пасёлку Печышчы. І не адзін, а разам з Уладзіславай Францаўнай, якая яшчэ ў 1943 годзе ў сваіх «Успамінах пра Янку Купалу» пісала аб гэтым (гл. газету «Савецкая Беларусь», літаратурны дадатак, № 3). Такім чынам, не магла яна сказаць пані Ч., што Купала жыў у Горкім.

Другая недакладнасць: «У 1942 годзе ён выехаў у Маскву па запрашэнню на з'езд пісьменнікаў». На самай жа справе Я. Купала, як пісала аб гэтым у тых жа «Успамінах» Уладзіслава Францаўна, выехаў у Маскву «па запрашэнню таварыша Панамарэнкі». А што датычыць з'езда пісьменнікаў, то ніхто яго ў той час не збіраў і не праводзіў.

Аўтар публікацыі А. Каўка дае папраўкі да гэтых выказванняў пані Ч. Але тое, што непраўдзівым з'яўляецца амаль кожны яе сказ, магло б і насцярожыць даследчыка, навесці на думку аб безадказнасці сведчанняў гэтай жанчыны.

Так, чытаем далей: «Пакой ягоны месціўся на другім паверсе». Размова ідзе аб месцы жыхарства Я. Купалы ў гасцініцы «Масква». На самай жа справе ён жыў на 4-м паверсе, у нумары 414. І Уладзіслава Францаўна, якая прыехала ў Маскву на пахаванне, не магла пра гэта не ведаць.

Трэба сказаць, што ў тыя трагічныя дні я таксама знаходзіўся ў Маскве і ўдзельнічаў у пахаванні Янкі Купалы. Мне давялося бачыць народнага паэта жывым недзе за два тыдні да яго смерці. Прыехаўшы ў Маскву, ён зайшоў у беларускае пастпрэдства, каб атрымаць прадуктовыя карткі. Знерваваная дзяўчына, якая займалася гэтай справай, сустрэла яго няветліва:

— Кто вы такой?

Тон яе не змяніўся, калі паэт назваўся: «Купала».

Я, быўшы сведкам гэтай размовы, кінуўся да Уралавай, якая тады ўзначальвала Народны камісарыят асветы і курыравала пытанні адукацыі і культуры. Ёй не трэба было тлумачыць, хто такі Купала. Уралава, таксама ўзрушаная крыўднай недарэчнасцю, распарадзілася тут жа яе з прабачэннямі выправіць.

(Застаецца дадаць, што мая прысутнасць у той час у тым месцы была звязана з маёй работай. Я ўзначальваў аддзел тэатраў ва Ўпраўленні па справах мастацтваў пры Саўнаркоме БССР).

Дык вось мне, каму давялося стаяць у ганаровай варце ля труны Я. Купалы ў Саюзе пісьменнікаў СССР, дзіўна чытаць такія фантазіі ва ўспамінах: «Жонка, выслухаўшы вестку аб дапушчальнай смерці, зажадала адкрыць труну памёрлага. Ёй адмовілі, спасылаючыся, што нябожчык вельмі скалечаным выглядае і бачыць яго было б страшэннай для яе траўмай (труна была наглуха забіта)... Яна імгненна ўсё зразумела. Янка Купала загінуў не праз няшчасны выпадак...»

Не буду затрымліваць увагу чытача на тым, што для такой катэгарычнай высновы тут не хапае аргументаў. Але справа нават не ў гэтым, а ў тым, што нічога падобнага не магло адбыцца наогул. Труна была адчынена, і кожны мог убачыць нябожчыка і развітацца з ім. На яго твары былі бачны пашкоджанні, якія з'явіліся ў выніку падзення ў лесвічны пралёт. Затым труну ўнеслі ў машыну, і жалобная працэсія накіравалася да крэматорыя.

Ля крэматорыя сабралася шмат людзей, якія прыйшлі праводзіць Купалу ў апошні шлях. Труну ўнеслі ў крэматорый. Праз некалькі хвілін я падышоў да прадаўгаватага акенца памяшкання крэматорыя і ўбачыў Купалу ў апошні раз. Ён ляжаў на невысокім памосце. Раптам узніклі чырванавата-блакітныя языкі вогнішча, якія неўзабаве ахапілі ўсё цела. І ў гэты самы час я пачуў жаночы крык: «Ой, Яначка!.. Мой Яначка!..» Я спытаў: «Хто гэта?» Адказалі: «Гэта цёця Уладзя. Толькі што прыехала з-пад Казані. Нават не паспела развітацца з Купалам». У мяне да гэтага часу стаіць у вушах гэты крык.

А з гэтага вынікае, што Уладзіслава Францаўна толькі што прыехала ў Маскву і ніякіх просьбаў аб развітанні з Купалам да «афіцыяльных асоб» быць не магло, таму што яна і труны нават не бачыла.

Такім чынам, хто ж усё гэта прыдумаў? Пані Ч. ці пані Свяневіч? І навошта?

Уладзімір НЯФЁД,
член-карэспандэнт АН Беларусі.

АД РЭДАКЦЫІ: Як бачым, аўтар нашай ранейшай публікацыі Аляксей Каўка не па-даследчыцку, а хутчэй эмацыянальна даверыўся мемуарным запісам, якія ён адшукаў у Лондане. І зразумець яго можна. Мы маем справу з выпадкам, абставіны якога да канца невядомы, і таму нязварта адпрэчваць любыя, нават пераказаныя сведчанні, звязаныя з ім. А. Каўка, прыводзячы ў газеце памянёныя запісы, між тым робіць скідку на ўласцівасці людской (тым больш жаночай) памяці. Але, напэўна, на гэтыя ўласцівасці была і яго стаўка. Успаміны ярчэй абуджаюцца ў сутыкненні з іншымі, паралельнымі ўспамінамі, робяць зачэпку на яго недакладнасцях. Так адбылося і на гэты раз. Уладзімір Іванавіч Няфёд, адзін з нямногіх жывых сведкаў пахавання Янкі Купалы, УПЕРШЫНЮ за столькі год падзяліўся ў друку тым, што зберагаў у памяці.

КУПЛЮ

дом ці сядзібу пад дачу ў Мінскім, Лагойскім ці Дзяржынскім раёнах. Звяртацца па тэл. 32-43-03.

ПРАДАЮ

халадзільнік «Снайге», разборную мэблю, кухонныя сталы, мэблю для дачы, пісьмовы стол, старую нажную швейную машыну. Усё б/у. Тэл. у Мінску 51-07-82;

польскую кухню «Зося» б/у ў добрым стане за СКВ. Тэл. у Мінску 51-07-82.

ЗДАЮ

аднапакаёвую кватэру за СКВ. Тэл. у Мінску 47-63-94.

ФАЛЬКЛОР І ДЗЕЦІ

Адкуль, «Вашчылкі», будзеце?

Ці бачылі вы такое, каб спявала ўся зала? Гэта здараецца, калі на сцэне «Вашчылкі» — фальклорны ансамбль Крычаўскай дзіцячай музычнай школы № 1. Адзінаццаць дзяўчынак і саліст Кірыл Пятроў у беларускім традыцыйным адзенні прыгожымі, гучнымі галасамі выконваюць беларускія народныя песні. Атрымліваецца ў іх хораша, весела, выразна, і цяжка ўтрымацца, каб не падпець, не памагчы маленькім артыстам, тым больш, што сярод гледачоў шмат сваякоў і родных — мамы, таты, бабулі і дзядулі. Пра назву ансамбля ахвотна расказваюць дзеці. Яна звязана з мінулым, калі народны герой Васіль Вашчыла змагаўся за лепшае жыццё крычаўскіх сялян.

У настаўніцкім асяроддзі гэтай школы здаўна жыве любоў да народнай песні. Валянціна Артураўна Шуганава 30 гадоў была дырэктарам школы і кіравала народным хорам. Ведала, збірала, любіла і цудоўна спявала народныя песні. Гэтае захапленне перадала ў спадчыну новаму дырэктару — сваёй былой вучаніцы Людміле Жабуроўскай.

Фальклорны калектыў «Вашчылкі» існуе толькі тры гады, але ўжо даволі вядомы ў сваім горадзе і на Магілёўшчыне. Дзеці сталі лаўрэатамі абласнога і рэспубліканскага конкурсаў. Іх запрашаюць на свае святы прадпрыемствы і гаспадаркі раёна. А на традыцыйным фальклорным фестывалі «Галасы над Сожам» гэта быў адзіны дзіцячы калектыў сярод дарослых. І тут яму спадарожнічаў поспех.

— Аснову рэпертуару «Вашчылак» складаюць песні-калыханкі, забаўлянкі, гульні. Іх мы з дзецьмі запісваем ад старэнькіх бабулек у час фальклорных экспедыцый. У нашым раёне шмат пажылых людзей, якія ведаюць старадаўнія народныя песні, ахвотна іх спяваюць і вельмі рады навучыць унукаў і праўнукаў, — расказвае кіраўнік «Вашчылак» выкладчыца музыкі Галіна Бацвіннік.

Безумоўна, нельга любіць тое, што не ведаеш і чаго не бачыў. Усе ўдзельнікі ансамбля выраслі ў вёсцы. Туды яны наведваюцца ў час канікул, там упершыню пачулі народную песню.

Напрыклад, Іра Жукава, дзяўчынка з блакітнымі вачамі і льнянымі косамі, мае моцны голас, ён нібы спецыяльна дадзены для выканання народных песень. У іхняй сям'і цудоўна спяваюць мама і бабуля. Выдатна таксама спяваюць мама і сястра Тані Лыскавай, мама Іры Батурэвіч. А Вольга Раманко ад сваёй бабулі ведае столькі народных песень, што іх можа хапіць на некалькі праграмных выступленняў.

Дарэчы, у Крычаўскім раёне, дзе шануюць культурную спадчыну і традыцыйнае мастацтва, кожны з семнаццаці клубаў і сямі сельскіх Дамоў культуры мае свой фальклорны калектыў.

Тамара КАРОЛЬ.

Рубрыку «БЕЛАРУШЧЫНА» вядзе журналіст Алена ЦІХАНОВІЧ. Тэлефон 32-35-05.

ЧЫСЦІНЯ І ПАРАДАК — ВАША ВІЗІТНАЯ КАРТКА

Некалькі парад па догляду за халадзільнікам

* **Унутраныя паверхні халадзільніка** трэба не радзей двух разоў у месяц пасля размарожвання мыць цёплай вадой (30—35°С) з дабаўленнем пітной соды (1 сталовая лыжка на 1 літр вады), а затым праціраць насуха і праветрываць паўгадзіны. Гэта прадухіляе ўзнікненне непрыемных пахаў.

* **Пры захоўванні прадуктаў** у халадзільніку можа ўзнікнуць устойлівы непрыемны пах, які перадаецца свежым прадуктам, асабліва маслу і сыру. Для ліквідацыі такіх пахаў эфектыўны спецыяльны паглынальнік «Рута». Каробку з паглынальнікам змяшчаюць на паліцу халадзільніка. Праз некалькі тыдняў, калі актыўнасць прэпарата (каробка напоўнена актывіраваным вугалем) знізіцца, яго трэба дастаць і прагрэць на працягу 12—18 гадзін, на яркім сонцы або на ацяпляльнай батарэі. Актыўнасць вугалю адновіцца. Гэты прыём можна паўтараць шматразова.

* **Для мыцця пластмасавых і афарбаваных маслянай фарбай паверхняў** можна апрача спецыяльных прэпаратаў прымяняць і любы сінтэтычны мыйны сродак, які раствараюць у невялікай колькасці цёплай вады (1 сталовая лыжка на 1 літр). Затым паверхню трэба прамыць чыстай цёплай вадой і выцерці насуха. Пры гэтым нельга прымяняць гарачую (вышэй 50°С) ваду, бо афарбаваная паверхня можа страціць бляск, а ў некаторых выпадках і зусім разбурыцца. Па гэтай жа прычыне не варта выкарыстоўваць мыла і асабліва соду.

Паверхні, пафарбаваныя маслянай фарбай, можна таксама мыць цёплай вадой, у якую дабаўлены нашатырны спірт (1 сталовая лыжка на 1 літр вады).

АЗБУКА ЛЕКАВЫХ РАСЛІН

Наготкі (календула лекавая)

Для лекавых мэт выкарыстоўваюць кветкавыя кошыкі. Збіраюць іх у час цвіцення (за сезон 15—20 разоў), у перыяд гарызантальнага размяшчэння язычковых кветачак (абрываючы без кветаножак), сушаць у цяні (ці ў сушылках пры тэмпературы 40—45°С). Пах у іх слабы, прыемны.

Прэпараты календулы (настойка, мазі) і свежы сок расліны прымяняюцца часцей вонкава як антысептычны і процізапаленчы сродак для паласканняў пры ангіне, хранічным танзіліце, запаленнях дзясняў, слізістай абалонкі носа, у выглядзе прымочак пры кан'юнктывітах (запаленне слізістай павекаў). Календула дзейнічае бактэрыцыдна на ўзбуджальнікаў гэтых захворванняў — стрэптакокаў, стафілакокаў; больш таго, устаноўлена яе высокая процівірусная актыўнасць. Настойка выкарыстоўваецца і для ванняў пры дыятэзах і экземах. Маззю з календулы адводзяць барадаўкі, мазалі, прымяняюць яе пры трэшчынах скуры, апёках, абмарожваннях, раненнях і запаленчых захворваннях скуры. Мазь можна прыгатаваць у хатніх умовах. Для гэтага расціраюць 10 г здробненых у парашок сухіх кветак, старанна змешваюць з 50 г ланаліну ці вазеліну. Аднак калі ёсць магчымасць, то для прыгатавання яе лепш выкарыстаць свежы сок расліны, змяшаўшы яго з ланалінам (у прапорцыі 1:10).

Свежыя здробненыя лісты расліны прыкладаюць да пухлін, нарываў і язваў.

Сок кветак календулы, змешаны ў роўных частках з сокам лімона, парэчак і мандальнага масла, можа быць выкарыстаны для вывядзення рабаціння. Атрыманым саставам праціраюць скуру 2 разы ў дзень. Праз некаторы час рабаціннe блякне ці знікне зусім.

Унутр прэпараты календулы прымаюць радзей. Але ў той жа час устаноўлена, што яны аказваюць жоўцегоннае ўздзеянне, зніжаюць артэрыяльны ціск, супакойваюць цэнтральную нервовую сістэму і паляпшаюць сон.

НЕПАЖАДАНЫЯ СУСЕДЗІ

Моль

«У майй дачні вялікая непрыемнасць: моль з'ела вязаныя шапачкі, шкарпэткі, верхняе адзенне, зімнія шапкі, нават ніткі... Ды што пералічваць! Раскажыце, ці ёсць паратунак ад молі».

З пісьма А. КОЖУХ (г. Брэст).

Сапраўды, барацьба з моллю дастаткова складаная. Але рэчы ад шкоднікаў захаваць усё ж можна, калі правільна карыстацца прэпаратамі, якія выпускае прамысловасць.

Першае, што трэба памятаць: розныя прэпараты маюць рознае прызначэнне. Для закрытых сховішчаў адзення (шафаў, чамаданаў, антрэсоляў) прызначаны таблеткі «Дэзмоль», пласцінкі «Малемор». Іх дзеянне заснавана на паступовым выпарэнні хімічнага рэчыва, якое губіць насякомых. Іх замяняюць 2—3 разы ў год. Можна карыстацца таблеткамі «Антымоль», хоць іх дзеянне менш эфектыўнае, мяняць іх на новыя трэба кожны месяц. Развешваць гэтыя прэпараты ў пакоях, за дыванамі не мае сэнсу, а здароўю чалавека можна нават пашкодзіць.

Другая група хімічных сродкаў прызначана для знішчэння насякомых і іх лічынак у адкрытых памяшканнях шляхам кантактнага уздзеяння. Гэта аэразолі «Аэраантымоль», «Супразоль». Апрацоўку дываноў, дарожак і г. д. імі трэба рабіць 2 разы ў год. Эфектыўны і з прыемным пахам прэпарат «Супраміт», але карыстацца ім трэба з пульверызатарам. Блізкія да іх «Керамід» і «Каўроль».

Гэта ўсё хімічныя сродкі. Але моль таксама адпужваюць высушаная апельсінавая цэдра, герань, тытунёвы ліст: іх трэба змясціць у кішэні адзення. Эфектыўны супраць лятаючых насякомых парашок пірэтруму (высушаныя і здробненыя кветкі каўказскага або далмацкага рамонку). Гэты парашок распыляюць у памяшканні гумавай грушай з разліку 3—4 г на квадратны метр.

Барацьба з моллю цяжкая, таму лепш папярэдзіць яе з'яўленне: 1—2 разы ў месяц рабіць вільготную ўборку памяшкання з дэзінфікуючымі сродкамі: захоўваць чыстыя, сухія рэчы ў добра закрытых поліэтыленавых мяшках або пакетах, перад тым як шарсцяныя рэчы ўбраць на захоўванне, «пракаліць» іх некалькі гадзін на сонцы.

Шашаль

«У кватэры ў нас з'явіліся маленькія карычневыя жучкі, лятаюць, усюды поўзаюць. Як з імі змагацца?»

З пісьма Л. ПЯТКЕВІЧ (Пухавіцкі раён).

Цёмнабуры вусаты жучок менш запалкавай галоўкі, у палёце падобны на невялікую мушку з тонкімі крыльцамі, пры пасадцы накрывае іх цёмнымі жорсткімі надкрылкамі — гэта шашаль-анабіум. Калі на мэблі, часцей за ўсё з зацемненага боку або ў падлозе з'явіліся невялікія круглыя адтуліны, а пад імі кучкі «буравой мукі», то гэта верная прыкмета, што ў кватэры пасяліўся шашаль.

Весці барацьбу з гэтым шкоднікам цяжка. Лягчэй папярэдзіць яго з'яўленне. Паліраваную мэблю трэба сістэматычна апрацоўваць паліруючымі сродкамі «Паліроль», «Лоск», і г. д. Паркетную падлогу націраць масцікамі, якія ўтрымліваюць шкіпінар. Нелакіраваныя і неафарбаваныя часткі мэблі праціраць анучкай, злёгку змочанай вазеліновым маслам або сумессю з 3 частак шкіпінару і 1—газы. Можна выкарыстаць таксама насычаны раствор нафталіну ў бензіне. Усе гэтыя прэпараты ўводзяць у праточаныя жучком адтуліны машыннай адвёрткай, піпеткай або шпрыцам, а зверху замазваюць воскам, замазкай або парафінам.

Найбольш эфектыўны сродак барацьбы — вадкія ядахімікаты, якія лёгка выпараюцца. Звычайна ядавіты састаў рыхтуюць з трох частак: 1 частка шкіпінару (або газы, мінеральных маслаў), 1 частка любой смалы (або дзёгцю, чорнай карболкі) і 1 частка нафталіну. Ад такога саставу гінуць не толькі шашаль, але і амбарныя даўганосікі, кляшчы і г. д. Растворам трэба добра змазаць адтуліны 2—3 разы з інтэрвалам у 20—30 дзён.

РОЗГАЛАС

ЭКСПРЭС-АПЫТАННЕ

«СЁННЯШНІ ДЗЕНЬ—РАШАЮЧЫ»

Учора мы ўжо рабілі экспрэс-апытанне на тэму аб сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў СНД у Мінску. Свае адносіны да гэтай падзеі выказалі рабочы, карэкціроўшчык, бесспрацоўны. Сёння даём слова вайскоўцам, людзям, чые лёсы ў многім будуць залежаць ад таго, як закончацца пасяджэнні...

Уладзімір ХОЛАД, падпалкоўнік, намеснік камандзіра часці па выхаваўчай рабоце, г. Мар'іна Горка: Нам вельмі хочацца пачуць аб захаванні адзінага камандавання для армій усіх краін Садружнасці. Зараз, на мой погляд, нельга прымусова ставіць на розныя бакі барыкады ваеннаслужачых, якія па волі лёсу былі аднапалчанамі і прысягу аднолькавага зместу прымалі ў адзін дзень і адзін час. Калі мэты ўсённяшніх дзяржаў адны, калі выйсце з цяжкага эканамічнага становішча рэспублікі шукаюць разам, то і армія павінна быць у іх адзінай. Я па нацыянальнасці ўкраінец, але палітычныя погляды ўрада Беларусі мне на сённяшні дзень значна бліжэйшыя, чым тыя меркаванні, якія гучаць з Украіны, і я, нягледзячы на ўзвядзенне межаў і мытняў, зусім не збіраюся пакідаць гэты цудоўны край. Служыць я хачу тут, і наш «сямейны рэферэндум» — з жонкай і дзецьмі — па гэтаму пытанню быў нядоўгім.

Пётр КРАСНОЎ, палкоўнік, ваенком Кастрычніцкага раёна г. Мінска: Сённяшняя сустрэча — рашаючая, гэта не толькі мая думка. Будзе рашацца лёс усяго афіцэрства — так ці інакш. Хай будзе тое, што будзе, толькі каб хутчэй скончылася гэтая паласа невядомасці, усе кропкі над «і» даўно пара расставіць. Мне здаецца, трэба пазбавіцца ад ілюзій наконт адзінай арміі. Гэтага ўжо не будзе. Адзінаццаць дзяржаў — адзінаццаць армій, а ўжо якое ў каго будзе войска — залежыць ад бюджэту дзяржаў. Хай усе маюць уласныя ўзброеныя сілы, такое права дадзена любой краіне.

Аляксандр ЗУБКОЎ, маёр: Я беларус і прытрымліваюся той думкі, што наша дзяржава мае права на паўнацэнныя ўласныя ўзброеныя сілы. Магчыма, выкажу крамольную на сённяшні дзень думку, але я цвёрда ўпэўнены ў тым, што так лёгка развітвацца з ядзернай зброяй, з ракетамі меншай дальнасці не было патрэбы. Дзяржаўны сакратар ЗША наведаў Беларусь толькі з-за таго, каб разабрацца з гэтым пытаннем, і я не думаю, што наступны яго візіт да нас адбудзецца хутка. Мы цяпер для вялікіх дзяржаў не ўяўляем аніякага інтарэсу, і апынёмся на задворках сусветнай і еўрапейскай палітыкі. Беларусь знаходзіцца ў акружэнні пяці дзяржаў. Невядома, як будуць з цягам часу разгортвацца падзеі ў нашых суседзяў, дзе чые будуць інтарэсы, як яны стануць вырашацца і чым. Ваенныя ж шляхі заўсёды вялі праз Беларусь...

Падрыхтаваў Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

ЯШЧЭ АДНА ЗАЯВА

Падтрымаць рэферэндум — менавіта такая ідэя вынікае з заявы, прынятай 7 лютага на нарадзе прадстаўнікоў Аб'яднанай дэмакратычнай партыі Беларусі, БНФ, Беларускай Сацыял - Дэмакратычнай Грамады, Беларускай сялянскай партыі, Беларускай хрысціянска-дэмакратычнай злучнасці, Мінскага гарадскога страйккама, Нацыянальна - дэмакратычнай партыі Беларусі, Свабоднага прафсаюза Рэспублікі Беларусь. Заява ўтрымлівае катэгарычнае сцвярджэнне, што «на Беларусі захоўваецца манапольная ўлада тых, хто давёў рэспубліку да мяжы краху, а народ — да галечы». Усё гэта можа прывесці да сацыяльнага выбуху. «Усенароднае галасаванне аб роспуску ВС і новых выбарах вышэйшага прафсаюзнага органа ўлады паводле дэмакратычнага выбарчага закона — гэта рэальны, законны, мірны шлях выхаду з палітычнага крызісу»—лічаць аўтары заявы. Яны прапануюць у якасці першага кроку кампаніі «За рэферэндум» маніфестацыю на плошчы Незалежнасці 19 лютага а 15 гадзіне.

НАРЭШЦЕ ДАЧАКАЛІСЯ

АСІПОВІЧЫ. Відаць, многія асіпаўчане, уключаючы тэлевізар, не аднойчы ўспаміналі благім словам усё міністэрства сувязі, якое амаль нічога не рабіла для таго, каб палепшыць якасць гуку, выяўлення, і павялічыць колькасць прымаемых праграм. Мабыць, голас народа нарэшце дайшоў да «вярхоў», бо зараз на ўскраіне горада вядзецца будаўніцтва магутнай рэтрансляцыйнай станцыі. Работай заняты падрадзяленні Міністэрства сувязі і інфарматыкі рэспублікі.

КАНФЛІКТНАЯ СІТУАЦЫЯ

Няўжо апошні мітынг?

Як выйсці з сацыяльна-эканамічнага крызісу, у якім апынулася наша грамадства? Праясніць пазіцыі бакоў, знайсці, па магчымасці, узаемаразуменне — у асноўным менавіта гэтым была выклікана неабходнасць сустрэчы Старшыні Вярхоўнага Савета РБ С. Шушкевіча і прадстаўнікоў урада з прафсаюзнымі актывістамі рэспублікі, якая, як вядома, адбылася ў мінулую пятніцу.

Галоўныя тэзісы і вынікі сустрэчы ўжо атрымалі сваё асвятленне ў друку. А што вынеслі з яе канкрэтныя яе ўдзельнікі?

Прадастаўляем слова сустаршыням Асацыяцыі незалежных прафсаюзаў прамысловасці Рэспублікі Беларусь А. БУХВОСТАВУ і Г. ФЯДЫНІЧУ.

А. Бухвостаў: З самага пачатку вымушаны выказаць заўвагу ў адрас «Звязды». У справаздачы, змешчанай у газеце, гаворыцца, у прыватнасці, што некаторыя лідэры ФПБ выказваліся за тое, каб у дні сустрэчы на вышэйшым узроўні ў Мінску правесці мітынгі і пікеты з мэтай уздзейнічаць на лідэраў дзяржаў—членаў СНД. Дык вось, за гэтыя акцыі выказваліся менавіта мы, а не кіраўнікі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

— Заўвага прымаецца. Аднак перанясёмся ў думках у залу пасяджэнняў ВС, дзе адбылася сустрэча. Нагадаю адну з сітуацый: Старшыня Вярхоўнага Савета выказаўся ў тым сэнсе, што ўрад спачатку заблытаў сітуацыю з падаткамі, а цяпер спрабуе зваліць віну на парламент. Кіраўніцтва ж урада, хоць і ў іншых абставінах, неаднаразова сцвярджала, што, нягледзячы на двухбаковую дамоўленасць, ВС чамусьці пазбавіў Саўмін рэспублікі права на карэкціроўку тых ці іншых ставак падаткаў...

Г. Фядыніч: Здагадвацца аб тайных спружынах гэтага канфлікта не збіраюся. Разумны сэнс падказвае: калі Закон аб падаткаабкладанні ВС прымаў з падачы Саўміна, то і трэба было даць апошняму ўсе неабходныя паўнамоцтвы. А цяпер Вярхоўны Савет імкнецца перавесці стрэлку ўсеагульнай незадаволенасці новым законам у бок урада. Што гэта, паказчык кампетэнтнасці?

А наогул я асабіста крайне незадаволены ходам і вынікамі сустрэчы. Вось і некаторыя мае калегі па прафсаюзнай дзейнасці — яны выступілі ў лепшых традыцыях былога часу: гаварылі аб цяжкасцях, сваіх бедах...

Між тым, у той аўдыторыі для выступленняў трэба было шукаць іншую танальнасць — узнімаць праблемы больш высокага ўзроўню, пераводзіць іх у палітычную плоскасць. Другі бок, дарэчы, выглядаў не лепш...

А. Бухвостаў: Зразумела, дыскусія ёсць дыскусія — эмоцыі і ўсё такое. Але на такім узроўні абавязкова неабходна дакладнасць. Мы спадзяваліся, што на сустрэчы з намі падзеляцца канкрэтнымі думкамі, праграмай, прадставяць канцэпцыю дзеяння па выводзе грамадства з крызісу. Прагучалі ж, у большасці, агульныя пажаданні. Скажу прама: мы супраць такой размытай пазіцыі.

Старшыня Вярхоўнага Савета, як звычайна, заклікаў да сацыяльнай згоды. Але, прабачце, кожны кіраўнік, які знаходзіцца ля руля ўлады, міжволі схіляецца да такіх умоў усеагульнай згоды, якія былі б выгаднымі той жа ўладзе. Мы ж лічым, што згода ў грамадстве можа з'явіцца толькі на ўмовах, якія падыходзяць працоўным масам. А як яны сталі жыць пасля стварэння Садружнасці Незалежных Дзяржаў — усім вядома. Хоць ідэя стварэння СНД сама па сабе была разумнай.

— Прабачце тады і мне, але днямі ў Маскве кіраўнікі ўрадаў дзяржаў Садружнасці прынялі новыя важныя рашэнні ў напрамку стабілізацыі эканамічных адносін.

Дарэчы, газеты пісалі, што беларуская дэлегацыя на чале з кіраўніком урада нашай рэспублікі В. Кебічам заняла даволі прынцыповую пазіцыю.

Г. Фядыніч: Аднак газеты пісалі і пра тое, што ён выказаў шкадаванне з прычыны адсутнасці ў вярхах СНД поўнай згоды і даверу. Працоўныя, усе мы гэта ўжо і так адчулі. Вось і думаю: навошта тады было збірацца ў Віскулях? Усе памятаюць, што ў свой час было падпісана міжурадавае пагадненне аб захаванні адпаведных дагаворных абавязацельстваў у прамысловасці ў першым квартале. Ніхто, аднак, і не думаў яго выконваць.

Дык ці існуе СНД? Працоўныя адносна гэтага нібы ў тумане, ніхто ім прама нічога не кажа.

А. Бухвостаў: Не пабаюся сказаць і больш рэзка: СНД на сённяшні дзень выглядае фарсам. Усё насельніцтва былых саюзных рэспублік, і Беларусі таксама, чакала ўзгодненых дзеянняў. Але адкуль ім узяцца, калі не вырашана галоўнае — заканадаўчае афармленне эканамічнай адказнасці за выкананне ўрадавых пагадненняў. Церпяць жа працоўныя. Дорага ім каштуюць хітрыкі палітыкаў.

— Абвінавачваеце вы — абвінавачваюць і вас. Прафсаюзы — у папулізме, многія працоўныя калектывы — у тым, што прывыклі гнаць нікому не патрэбную прадукцыю і пры гэтым бязбедна жыць. Вось і Старшыня Вярхоўнага Савета заўважыў, што самая, магчыма, кепская спадчына, якая засталася ад былых часоў, — гэта спадзяванні кожнага на дзяржаву.

Г. Фядыніч: А я сказаў бы, што рабочы чалавек у асноўным на свой дабрабыт заўсёды зарабляў уласнымі рукамі. Каб людзі маглі нармальна працаваць, трэба зняць усе штучныя бар'еры ў эканоміцы, якіх нямала з'явілася ў апошні час і чаго ніколі не было ў цывілізаваных краінах. Ці ж па віне працоўных калектываў склалася такая абстаноўка, калі на многіх прадпрыемствах рыхтуюцца загады аб вялікіх скарачэннях? Толькі ў адным Навукова-даследчым інстытуце сродкаў аўтаматызацыі мяркуецца скараціць 1.200 чалавек. Усе КБ і НДІ былога саюзнага падпарадкавання засталіся без работы.

А. Бухвостаў: Канстатацыю падобных фактаў можна было б працягваць бясконца. На буйных заводах, пачынаючы са снежня, пачаліся шматдзённыя перапынкі ў рабоце. І вось ужо на «Гомсельмашы» выдадзены загад аб пядрыхтоўцы (калі не зменіцца сітуацыя) да скарачэння сарака працэнтаў колькасці працуючых. Значыць, прыкладна 12 тысяч чалавек з іх сем'ямі застануцца без сродкаў для існавання. Такая галодная армія будзе здольная на вельмі многае. Нездарма псіхалагічны стан людзей на прадпрыемствах самы забастовачны, чуюцца ўжо і заклікі да адкрытых дзеянняў.

— Значыць, зноў узнімаецца тэма «камень з бруку — зброя пралетарыяту»?

А. Бухвостаў: Нічога новага не скажу, калі яшчэ раз падкрэслю: задача прафсаюзаў — змагацца супраць эканамічнага, цэнавага і іншага бязладдзя. Мы не можам і не будзем прыхарошваць сённяшнюю цяжкую сітуацыю. Але, з другога боку, і не нагнятаем яе — гэта, дарэчы, лепш робяць тыя, хто кіруе эканомікай і выдае няўдалыя законы.

Г. Фядыніч: Прафсаюзы заўсёды былі за вырашэнне эканамічных і сацыяльных праблем цывілізаванымі метадамі. Але...

Як ні дзіўна, у рэспубліцы да сённяшняга дня няма нармальнай прававой асновы, на якой выпрацоўваліся б сацыяльнае партнёрства і тая ж згода. Дастаткова ўспомніць, колькі часу ляжалі ў ВС праекты прафсаюзнага заканадаўства, якога, між іншым, мы не маем і сёння.

— Адсюль, як кажуць пры абмеркаванні няштатных сітуацый, якія вашы далейшыя дзеянні?

Г. Фядыніч: Яны будуць адэкватнымі патрабаванням абстаноўкі. 10 лютага мы атрымалі ў Мінскім гарвыканкоме дазвол на правядзенне ў сталіцы рэспублікі мітынгу. Яго асноўны лозунг — «Кіраўнікі СНД, дайце людзям магчымасць зарабіць на жыццё!» Ён адбудзецца сёння ў 11 гадзін каля грамадска-палітычнага цэнтра на вуліцы Кастрычніцкай.

А. Бухвостаў: Дарэчы, правесці мітынг на плошчы Незалежнасці нам не дазволілі. Што ж, мы імкнёмся ўсё вырашаць цывілізавана — спрачацца не сталі. Галоўнае, каб да кіраўнікоў урадаў дзяржаў СНД дайшоў голас працоўных — бо большасць з іх, што называецца, на грані. Не дай Бог, каб гэты мітынг стаў апошнім цывілізаваным актам барацьбы людзей працы за сваё права на элементарнае выжыванне.

Калі выключаны дыктафон. Магчыма, некаторыя з прыведзеных выказванняў здадуцца вельмі рэзкімі, не заўсёды апраўданымі. Аднак мы вырашылі іх не рэдагаваць.

Хваляванне прафсаюзных лідэраў таксама можна зразумець, таму што ў многім гэта боль і пачуцці працаўнікоў, што стаяць за імі. А наконт мітынгаў...

Думаецца, лепш, калі будуць адбывацца толькі такія акцыі, а не што-небудзь іншае, значна больш сур'ёзнае. Аб гэтым папярэджвае ўся наша гісторыя.

Валерый ЧАРНЯЎСКІ, аглядальнік «Звязды».

Знойдзены унікальны дакумент

Цікавы ліст прыйшоў днямі ў рэдакцыю кармянскай раённай з Санкт-Пецярбурга. Супрацоўнік дзяржаўнай публічнай бібліятэкі імя М. Я. Салтыкова-Шчадрына, беларус па паходжанню, Мікола Нікалаеў паведамляе, што ў Аддзеле рукапісаў «публічнай» знойдзены унікальнейшы дакумент, які пралівае святло на далёкае мінулае гісторыі мястэчка Карма.

Гэта юрыдычны акт, выпісаны з каптуровых кніг Рэчыцкага павета. Паводле гэтага ліста, складзенага 30 кастрычніка 1696 года, генерал павета ў прысутнасці шляхціцаў Яна і Міхаіла Закрэўскіх і пана Самуэля Хведаровіча падараваў рэчыцкаму гарадскому пісару Паўлу Калчэўскаму ў вечнае карыстанне двор Карма з навакольнымі барамі, сенажацямі і ўрочышчамі.

Нельга не звярнуць увагі на дзве даволі адметныя акалічнасці гэтага дакумента апошняга перыяду Вялікага княства Літоўскага. Ён напісаны на беларускай мове, нягледзячы на выдадзеную ў той год пастанову ўсеагульнай канфедэрацыі саслоўяў Рэчы Паспалітай аб забароне пісаць на ёй у Вялікім княстве Літоўскім дзяржаўныя дакументы. Падругое, справа гэтая прайшла праз рукі рэчыцкага падстарасты Стэфана Антонія Скарыны — нашчадка нашага славутага першадрукара і асветніка.

г.п. Карма.

● РАДЫЁПЕРАХВАТ ●

РАДЫЁ ПЕРАХВАТ

«ГОЛАС АМЕРЫКІ»

● Канкурэнтам Буша на першапачатковых выбарах на пасаду прэзідэнта стаў кансерватыўны журналіст і аглядальнік Пэт Б'юкэнен. Ён выступае за захаванне моцнай амерыканскай сям'і і надзейную абарону ЗША ад знешніх ворагаў.

● **Лівія заявіла аб сваёй гатоўнасці супрацоўнічаць з французскімі ўладамі ў расследаванні прычын выбуху французскага самалёта ў Афрыцы над Нігерам у 1989 годзе. Як вядома, у выбуху абвінавачваюцца лівійскія тэрарысты.**

● У сталіцы Самалі Магадзіша ідуць жорсткія баі паміж групоўкамі за ўладу. Паведамляецца аб шматлікіх ахвярах сярод мірнага насельніцтва. Генеральны сакратар ААН заклікаў да спынення баявых дзеянняў.

● **Як заявіў віцэ-прэзідэнт ЗША Куэйл, злосныя парушальнікі правоў чалавека, як гэта ні дзіўна, з'яўляюцца членамі камісіі ААН па правах чалавека.**

РАДЫЁПЕРАХВАТ

● Двое з трох вызваленых маджахедамі савецкіх палонных, захопленых у Афганістане, адмовіліся вяртацца на радзіму, пакуль сілы маджахедаў не звернуць рэжым Наджыбулы. Гэтыя палонныя — мусульмане з сярэднеазіяцкіх рэспублік.

БІ-БІ-СІ

● **Эдуард Шэварднадзе заявіў, што ў Маскве хутка можа адбыцца яшчэ адна спроба ваеннага перавароту, калі эканамічнае становішча не зменіцца ў лепшы бок. Сітуацыя пагаршаецца, а таму верагоднасць путчу сёння большая, чым летась. І ёсць усе падставы правым палітыкам замяніць на чале ўлады дэмакратаў. На думку Шэварднадзе, народ падтрымае гэты пераварот, бо ў жабрацкай і галоднай краіне людзей нельга пераканаць у неабходнасці падтрымкі дэмакратычных інстытутаў.**

● Барацьба сіхскіх сепаратыстаў за незалежнасць штата Пенджаб у Індыі адабрала за апошняе дзесяцігоддзе больш дзесяці тысяч чалавечых жыццяў. Зараз там сітуацыя настолькі вострая, што ў штаце ўведзена прэзідэнцкае праўленне.

РАДЫЁ «СВАБОДА»

● **Украіна і Беларусь адмовіліся падпісаць падрыхтоўчыя дакументы да нарады ў вярхах СНД у Мінску.**

● Эканоміка Польшчы ўяўляе сабой змрочную карціну. Нягледзячы на ўсе намаганні, Польшча не ператвараецца ў дэмакратычную краіну з рынкавай эканомікай. У дакладзе ўрада «Аб становішчы ў Польшчы» гаворыцца, што дзяржаўныя законы не дзейнічаюць, яны даюць магчымасць аферыстам нажываць мільёны, не плаціць падаткі, пачасціліся банкаўскія скандалы. Злачынасць дасягнула самага высокага пасля 1918 года ўзроўню. Урад скардзіцца на ўцечку за мяжу палітычных, эканамічных і ваенных сакрэтаў.

● **А. Жытнікаў, які адказвае за размеркаванне заходняй дапамогі ў Расіі, абверт чуткі, што 60—70 працэнтаў дапамогі раскрадаецца.**

● Малаверагодна, што заходнія банкі дадуць сёлета буйныя крэдыты былым савецкім рэспублікам з-за іх неплацежаздольнасці.

● **Адбылася сустрэча Ельцына і Руцкога. Паводле слоў апошняга, гутарка мела шчыры характар, погляды субяседнікаў па многіх пытаннях супалі.**

● Коль і Мітэран абмяркоўваюць шляхі стварэння аб'яднаных Франка-германскіх узброеных сіл. Такія сілы могуць быць створаны ўжо летам.

АЛЬБЕРВІЛЬ-92

Адзін медаль—на дзве... дзяржавы

Алімпійскія гульні — як і ўсё жыццё наогул: тут трыумф заўсёды суседнічае з няўдачай, узлёт — з падзеннем. І хоць папярэдні вопыт, гэтак жа, прынамсі, як і майстэрства, маюць несумненнае значэнне, на старце ўсе роўныя: прызнаны ты лідэр, сапраўдны маэстра ці — нясмелы навічок, што робіць па алімпійскіх арэнах самыя першыя крокі... Умовы для ўсіх аднолькавыя; задача таксама адна і тая ж: стартуй і выйгравай!

У наша нярадаснае, пакуль што беспрасветнае жыццё ўжо тройчы прыйшла хоць і маленькая, ды радасць: на рахунку спартыўнай дэлегацыі Садружнасці Незалежных Дзяржаў ёсць тры залатыя медалі алімпійскага Альбервіля. Следам за лыжніцай Любоўю Ягоравай чэмпіёнкай стала біятланістка Анфіса Разцова. Яна не проста стала мацнейшай у новай для алімпійскай праграмы дысцыпліне — біятлоне, а і прадэманстравала свае асабістыя ўнікальныя магчымасці. Чатыры гады назад Анфіса стала чэмпіёнкай Алімпійскіх гульняў у лыжнай эстафеце 4×5 кіламетраў і сярэбраным прызёрам — у лыжнай гонцы на дыстанцыі 20 кіламетраў. Поспех? Яшчэ які! Аднак неўзабаве нарадзіўся новы від спорту — жаночы біятлон, і Разцова, параіўшыся з мужам, вядомым у мінулым спартсменам - біятланістам, узялася асвойваць... стральбу з вінтоўкі на біятлонкай трасе. Тры гады настойлівых заняткаў і вось — новы трыумф. Першай у гісторыі алімпійскага руху чэмпіёнкай па біятлону стала яна, Анфіса Разцова.

А трэці залаты алімпійскі медаль дастаўся нашай зборнай у сераду — у спаборніцтвах фігурыстаў у парным катанні. Яго заваяваў дуэт з Санкт - Пецярбурга Наталля Мішкуцёнак — Артур Дзмітрыеў.

Скажу шчыра: гэтаму паведамленню абрадаваліся не толькі ў горадзе на Няве, але і ў... Мінску. І вось чаму.

Пятнаццаць гадоў назад у секцыі фігурнага катання на крытым катку ў парку імя Горкага ў беларускай сталіцы пачала займацца шасцігадовая Наташа Мішкуцёнак. Неўзабаве яе трэнерам стаў вядомы ў рэспубліцы фігурыст Аляксандр Вярковіч. Гэта былі тыя першыя крокі ў спорце, якія, у рэшце рэшт, і вывелі юную таленавітую спартсменку на алімпійскі п'едэстал. Пасля школы Наташа паступіла на вучобу ў Ленінградскі інстытут фізічнай культуры імя Лесгафта. Менавіта туды таму, што школа фігурнага катання Ленінграда (а цяпер, натуральна ж, Санкт-Пецярбурга) — даўно і ўсімі прызнана ў свеце. І найперш дзякуючы педагагічнай і трэнерскай дзейнасці такога выдатнага спецыяліста, як Тамара Мікалаеўна Масквіна. У яе прафесіянальную майстэрню фігурыстаў і была запрошана Наташа Мішкуцёнак.

З дасье «Звязды»

Майстар спорту міжнароднага класа Наталля Мішкуцёнак нарадзілася 14 чэрвеня 1970 года ў Мінску. Чэмпіёнка свету 1991 года, двухразовая чэмпіёнка Еўропы (1991, 1992 гг.). Алімпійская чэмпіёнка 1992 года.

— Думаю, Санкт-Пецярбург, а тым больш — Расія падзеляцца з намі гэтай узнагародай фігурыстаў,— сказаў мне ўчора першы намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь Мікалай Заічкоў. — Прыемна ўсё ж за нашу выхаванку...

Калі ўжо зайшла размова пра выхаванцаў беларускай фізкультурнай арганізацыі, зазначу, што ёсць яны і ў іншых відах спорту. Гэта, у прыватнасці, у зборнай па хакею лідэр адной з троек Мікалай Баршчэўскі. Цяпер ён выступае за сталічны «Спартак», а пачынаў некалі ў камандзе майстроў мінскага «Дынама». Праўда, пазаўчора каманда СНД прайграла ва ўпартай барацьбе зборнай Чэха - Славакіі — 3:4. Шайбы ў нашай камандзе зазначылі Ігар Краўчук, Дзмітрый Юшкевіч і Мікалай Баршчэўскі, у чэхаў — Гудас, Аўгуста, Ланг і Росал.

Чэмпіёнамі Алімпійскіх гульняў сталі: у гонцы на 10 кіламетраў сярод біятланістаў Марк Кіхнер (ФРГ), на аднамясцовых санках сярод жанчын — Дорыс Нойнер (Аўстрыя), а яе зямлячка Петра Кронбергер была мацнейшай у скорасным спуску на горных лыжах. Француз Фабрыс Гі выйграў лыжнае двухборства, а прадстаўніца ФРГ Жаклін Бернэр — дыстанцыю 1500 метраў на каньках.

У хакейным турніры канадцы перамаглі нарвежцаў— 10:0, французы—швейцарцаў—4:3.

Пасля чатырох дзён алімпійскіх баталій у зборнай Германіі чатыры залатыя ўзнагароды, у нашых спартсменаў і аўстрыйцаў—па тры.

Анатоль ФЁДАРАЎ.

ХАТНЯМУ МАЙСТРУ

Калі шкло разбітае

Не сумуйце, калі акно разбіта: замяніць шкло не так ужо цяжка. Перш за ўсё дастаньце з рамы асколкі, праверце, ці не засталіся яны ў фальцах (падоўжныя выемкі ў аконнай раме, у якія ўстаўляецца шкло).

Рамы памыйце, ачысціце ад старога кіту, пылу, добра прасушыце і прамажце аліфай або пафарбуйце: такая паверхня добра трымае кіт, а без яго не абысціся. Аконнае шкло вырабляецца так, каб яно лёгка ўваходзіла ў фальцы, запаўняючы іх прыкладна на тры чвэрці па шырыні, тады шкло не лопне ў набрынялай ад вільгаці раме.

1. Пры забіванні рамных шпілек скарыстайце пагнуты цвік з адсечаным вострым канцом. Гэта прадухіліць шкло ад драпін.

2. Больш практычна ўстаўляць шкло на двайны кіт. Кіт пры гэтым спосабе павінен быць не вельмі густым, а хутчэй рыхлым (як паста) у выглядзе валіка або стужкі на ўсю даўжыню і шырыню фальца. На яго ставяць шкло, шчыльна прыціскаючы па ўсяму перыметру так, каб паміж ім і бартамі фальцаў не было не запоўненых кітам месц. Выціснуты пры гэтым кіт разраўноўваюць нажом на прамы вугал або конус. Гэта дапамагае дасягнуць герметычнасці і выключыць страты цяпла.

3. Спаранае шкло (з паветранай праслойкай), устаўленае ў акно, змяншае страты цяпла, паслабляе вулічны шум, не замярзае ў маразы. Два шклы трэба пакласці адно на адно праз кардонную пракладку, пакрытую масленай фарбай. У раму шкло ўстаўляецца звычайным спосабам на кіт. Замест кардону можна выкарыстаць гумавыя пракладкі. Прасачыце, каб пры ўмазцы шкла не было шчылін.

4. На час моцных маразоў замацуйце на акне кавалачкамі лейкапластыра поліэтыленавую плёнку, вырасаную па памеру рамы. Верхні бок зрабіце ніжэйшым (на 100—150 мм) для цыркуляцыі паветра.

5. Невялікі прамавугольнік з кардону, бляхі або іншага шчыльнага матэрыялу, прыкладзены да шкла, пры афарбоўцы аконных рам абароніць шкло ад выпадковых мазкоў і дазволіць акуратна пафарбаваць раму.

6. Каб зафіксаваць шырыню праёму адкрытай форткі, надзеньце на яе кальцо з бялізнавай рызінкі. Перасоўваючы кальцо ўздоўж форткі, за кошт трэння паміж ёй і рамай вы замацуеце фортку ў патрэбным становішчы. Каб кіраваць форткай «дыстанцыйна», прывяжыце да яе запору тонкі трывалы шнурок, і вам не трэба будзе кожны раз узлазіць на табурэт, каб адчыніць або зачыніць фортку.

7. Калі форткі змацаваць кручком, то адчыняць іх можна абедзве адным рухам.

8. З трох дэталей ад дзіцячага канструктара можна зрабіць шарнірны абмежавальнік для форткі. Зачыніўшы яе, абмежавальнік пастаўце ў нерабочы стан. Пафарбуйце яго бяліламі, і ён будзе непрыкметным на фоне аконнай рамы.

9. Каб пыл не збіраўся ў зачыненым на зіму акне, перакрыйце адтуліну паміж унутранай і вонкавай форткамі кавалкам тонкага кардону або шчыльнай паперы ў тон рамы або папярэдне пафарбуйце яго, і перагародка не будзе моцна выдзяляцца. Гэтым вы паменшыце цеплаабмен паміж рамамі, і пакой будзе праветрывацца хутчэй.

10. Закітоўванне і заклейванне акон можна сумясціць у адной аперацыі. Разагрэйце у гарачай вадзе (70°) шпрыц без іголкі і парафін (свечку). Набярыце ў шпрыц парафіну і залівайце шчыліны, пачынаючы зверху.



КУЛІНАРНЫЯ РЭЦЭПТЫ

Пельмені ўральскія

Для цеста: 2 шклянкі мукі, 1 яйка, 3/4 шклянкі вады, соль па смаку.

Для фаршу: па 180 г мякаці ялавічыны і свініны, 120 г мякаці бараніны, 50 г масла, 2 г мускатнага арэха, 2—3 сталовыя лыжкі вяршкоў, 1—2 цыбуліны, соль, чорны молаты перац па смаку.

ДЛЯ ПРЫПРАВЫ: 3—4 зубочкі часнаку, 2 сталовыя лыжкі масла, 3 сталовыя лыжкі воцату, соль, чорны молаты перац па смаку.

Муку прасеяць, насыпаць горкай, у цэнтры зрабіць ямку, уліць ваду, 1/2 яйка, пасаліць, замясіць крутое цеста, пакінуць на 20—30 мінут, накрыўшы палатнянай сурвэткай.

Мяса два разы прапусціць праз мясарубку разам з маслам і мускатным арэхам, пасаліць, паперчыць, перамяшаць. Паступова ўліць у фарш вяршкі, дадаць нашынкаваную цыбулю і ўсё перамяшаць.

Потым раскатаць з цеста жгут, нарэзаць яго на невялікія кавалкі, з якіх раскатаць тонкія кружкі. На кружкі пакласці па чайнай лыжцы мяснога фаршу, краі іх злучыць і зашчыпаць. Узбіць астатнюю частку яйка, змазаныя ім гатовыя пельмені пакласці на бляху, пасыпаную мукой, і паставіць на холад. Гатаваць пельмені на пары 10—15 мінут.

Салата з капусты

3 кг капусты, 1 кг моркві, 1 кг цыбулі, 0,5 кг салодкага перцу, 400 г алею, 3/4 шклянкі 9-працэнтнага воцату, 1/2 шклянкі цукру, і сталовая лыжка солі.

Капусту нарэзаць вялікімі кавалкамі, моркву — кружкамі, цыбулю —кольцамі, перац — саломкай і змясціць усё ў вялікую пасудзіну. Алей, соль, цукар, воцат давесці да кіпення, заліць гэтай сумессю падрыхтаваную агародніну і ўсё варыць 10 мінут. Рэкамендуем дабавіць да гэтай салаты 1 чайную лыжку (ці менш) молатага чырвонага перцу. Гатовую салату раскласці ў літровыя слоікі і захоўваць у халадзільніку ці халодным памяшканні.

Рыба па-маскоўску

Філе рыбы, бульбу, цыбулю, і зваранае ўкрутую яйка, смятана, соль, чорны молаты перац, зяленіва.

Рыбу выпатрашыць, пачысціць, аддзяліць філе ад касцей, укачаць у муку, змяшаную з соллю, абсмажыць з абодвух бакоў. Цыбулю нарэзаць кольцамі, укачаць у муку, абсмажыць з абодвух бакоў, пасаліць, яйка пачысціць, нарэзаць кружкамі.

На бляху ці металічнае блюда пакласці слой бульбы, на яго — слой рыбнага філе, на рыбу «луской» пакласці бульбу, цыбулю, яйка, злёгку пасаліць, паперчыць, заліць смятанай, запячы ў духоўцы да ўтварэння залацістай скарынкі.

Гэтая страва, пасыпаная дробна нарэзаным зеляніваам пятрушкі ці кропу, упрыгожыць любы стол.

ЗААПАРК У СЕНЦАХ

Марская свінка

Гэта, бадай, самая спакойная і непатрабавальная жывёлінка. Характар у яе на дзіва пакладзісты. Калі толькі што набытага звярка вы пасадзіце на стол або на канапу, ён не стане мітусіцца, не паспрабуе саскочыць на падлогу і схавацца. Кусаецца свінка толькі ў крайніх выпадках, калі яе нечакана і груба схапіць і прыціснуць. На спакойныя і ласкавыя адносіны звярок гэты заўсёды адказвае адданасцю.

Трымаць свінку дома вельмі лёгка. Яна будзе адчуваць сябе добра ў любой скрыначцы ці каробцы. Толькі трэба штодзённа выпускаць яе пабегаць па кватэры. Паназірайце, як паводзіць сябе ваш гадаванец на такіх прагулках. Калі ён спрабуе грызці шпалеры, дайце яму ўзамен вялікі ліст паперы (не газетнай) або папяровую каробачку, ён з задавальненнем будзе гуляць з ёю. Калі ж свінка ўпарта працягвае грызці сцяну (тынкоўку), значыць, ёй не хапае мелу, корм трэба рэгулярна пасыпаць невялікай колькасцю дробна расцёртага яечнага шалупіння і гліцэрафасфату кальцыю.

Карміць свінку трэба як мага больш разнастайна. Яна з задавальненнем будзе есці ўсе фрукты і агародніну (як сырыя, так і вараныя), вараныя макароны і розныя кашы, не адмовіцца ад кавалачка каўбасы, мяса, сала. Іншы раз нават пагрызе костачку. Кавалачак лячэння, булкі — таксама пачастунак. Вельмі любіць хлеб, размочаны ў малацэ. З задавальненнем грызе галінкі пладовых дрэў, бярозы, ліпы.

Свінка любіць цяпло, і зусім не пераносіць скразнякоў. Лепш за ўсё наладзіць жытло ў куточку каля батарэі.

Калі вы заўважаеце, што ў марской свінкі моцна растуць кіпцюры, пакладзіце ў яе дом вялікі камень ці цэглу. Звярок з задавальненнем будзе ўзбірацца на яго, і кіпцюры паступова сатруцца.

Да ўвагі тых, хто шукае работу

УПРАЎЛЕННЕ БУДАЎНІЦТВА МІНСКАЙ ЦЭЦ-5

запрашае на работу

● БЕТОНШЧЫКАЎ ● МАНТАЖНІКАЎ ● ГАЗАЭЛЕКТРАЗВАРШЧЫКАЎ ● МУЛЯРОЎ ● ТЫНКОЎШЧЫКАЎ ● МАЛЯРОЎ ● ЦЕСЛЯРОЎ ● МЕХАНІЗАТАРАЎ

Аплата працы — кантрактная.

Прадастаўляецца добраўпарадкаванае жыллё ў п. Дружны згодна з кантрактам, а таксама ёсць магчымасці для будаўніцтва ўласнага. Адзінокім прадастаўляецца інтэрнат.

ЗВЯРТАЦЦА:

222823, г. п. Свіслач Мінскай вобласці Пухавіцкага раёна. Прамплянцоўка УБ ЦЭЦ-5.

Тэл. У ПУХАВІЧАХ 53-4-89, У МІНСКУ — 36-56-17.

ЗАГАДКАВАЕ. НЕВЕРАГОДНАЕ. ФАНТАСТЫЧНАЕ?

Чалавек-амфібія

Гэтага чалавека, палкоўніка запасу З-нага, пагранічніка, адзначанага ўрадавымі ўзнагародамі (у тым ліку за затрыманне парушальніка граніцы) — цяжка назваць фантазёрам або містыфікатарам. Аднак гісторыя, якую ён расказаў, вельмі падобная на небыліцу, хоць палкоўнік клянецца, што ўсё, што здарылася з ім у 1963 годзе ў кагульскіх плаўнях (гэта непадалёк ад савецка-румынскай граніцы) —праўда ад пачатку да канца. Толькі праз 28 гадоў ён рашыўся расказаць аб гэтым, ды і то не рызыкнуў абнародаваць сваё прозвішча — баіцца, што былыя саслужыўцы вырашаць, што ён, так сказаць, не зусім пры сваім розуме. Па тых жа меркаваннях—З-ны.

— Хлопец я быў тады яшчэ нежанаты, лейтэнант бязвусы, але сілы — хоць адбаўляй, вось і панадзіўся раніцай, калі служба дазваляла, паляваць у плаўнях — вялікіх азёрах, зарослых чаротам.

У той вераснёўскі дзень зарадзіў я сваю 12-калібравую «тулку», падперазаўся патранташам, бутэрброд, аптэчку —у бушлат, балотныя боты прымацаваў да заднягa сядзення матацыкла — і ў дарогу. Ад'ехаў кіламетраў дваццаць ад граніцы, матацыкл у канаву, абуў боты і ўвайшоў у плаўні.

Цішыня, калышыцца чарот... але — што такое? — чую нейкія стогны! Прыслухаўся: чалавек нібыта.

Іду ў бок стогнаў, толькі боты — чмяк-чмяк. Хутка, мінут праз дваццаць, дайшоў. Тут і сонца ўзышло, неба пасвятлела, з аранжавым такім адлівам, — і тут мяне ў халодны пот ад нечаканасці кінула.

Я хуценька крыж на сябе налажыў: выратуй, Божа! На плаваючай чарацянай «ляпёшцы» ляжыць жудаснага выгляду чалавекападобная істота. Цела чорна-карычневага колеру, масляністае нейкае, доўгае, брудныя, заблытаныя валасы, барада да пупа, уся ў зялёнай тване, істота гэтая ўся аблеплена п'яўкамі. А правая рука яго (як выявілася, гэта быў мужчына, зусім голы) уся ў крыві. Стогне — баліць...

Я падышоў бліжэй, але на ўсякі выпадак узвёў куркі. Бачу — вочы ўсе ў чырвоных прожылках, як у п'янага чалавека, а можа, ад болю ці страты крыві. Ён нібыта апрытомнеў і звярнуўся да мяне: ні то забулькаў, ні то заквакаў. Прыўзняў здаровую руку, паказвае на рану, і тут мяне зноў у пот кінула: гляджу, а наміж пальцаў на руках у яго — перапонкі, як у качкі. Потым ён сваімі пальцамі перапончатымі на экскаватар, які стаяў непадалёк, паказвае і нешта сваё булькае. Тут я здагадаўся, што напярэдадні, у час меліярацыйных работ, яго зачапіла каўшом і параніла, вось пра што ён «расказвае».

Падышоў я да яго, дастаў палявую аптэчку, зрабіў укол ад слупняку — ён нават не здрыгануўся, ачысціў параненую руку ад піявак, перавязаў яе вышэй ірванай раны жгутом. Бачу, ківае галавой, дзякуе. Праз некалькі хвілін ён адчуў сябе лепш, сеў на «сваім «востраве», выцягнуў ступні з вады — і тут я ўбачыў, што ногі ў яго, як ласты, — вялікія, перапончатыя.

Ён адламаў чараціну, зрабіў з яе дыхальную трубку і раптам спіной пайшоў пад ваду, ледзь не закрануўшы мае боты, — і больш я яго ніколі не бачыў.

Магнітафонны запіс гэтага расказа былога пагранічніка прапанавалі паслухаць вядомаму ў навуковых колах спецыялісту-этнографу, збіральніку старажытных кніг і сведчанняў аб рэдкіх выпадках Геворку Грыгарану (Ерэван). Вось як ён пракаменціраваў гэтую падзею:

— Нешта падобнае, паводле сведчання старажытных крыніц, можна было сустрэць у XV—XVI стагоддзях на старажытным армянскім возеры Ван (цяпер тэрыторыя Турцыі). Відавочцы пакінулі апісанні вадаплаўных людзей з характэрнымі перапончатымі рукамі і нагамі.

Некаторыя вучоныя, у прыватнасці Майкл Віржанскі (ЗША), лічаць, што зусім верагодна глыбока заканспіраванае існаванне людзей-амфібій. З-за шэрагу прычын замацаваліся мутацыі, што дазволілі ім прыстасавацца да воднага асяроддзя. Калі менавіта гэта адбылося — сказаць цяжка. Але, паколькі даследаванні фалькларыстаў даказалі, што народныя паданні аб русалках, вадзяных, лесунах і ведзьмах маюць адзін «узрост», то можна меркаваць, што ўсе тры галіны людзей — чалавек разумны, «снежны» чалавек (лесавік у рускім фальклоры) і «вадзяны» чалавек — адгалінаваліся ад агульнага продка, прычым амаль адначасова.

— Аднак я — прыхільнік другой версіі, — працягвае Геворк Грыгаран. — Аналаг гісторыі, якая здарылася з пагранічнікам З-ным, я знайшоў у французскім навуковым часопісе амаль 60-гадовай даўнасці. У той публікацыі расказвалася пра нейкага пана Франсуа (імя ўмоўнае), беспрацоўнага і бяздомнага чалавека, «бомжа», як бы мы яго сёння назвалі. Гэты чалавек, псіхічна хворы, пасяліўся ў паўзатопленым у Сене катэры, непадалёк ад Парыжа. Пры набліжэнні людзей ён ныраў у ваду і дыхаў праз гумавую трубку з самаробным паплаўком зверху, гадзінамі знаходзячыся пад вадой. Харчаваўся чайкамі, якіх лавіў і еў сырымі.

Калі ён загінуў у выніку няшчаснага выпадку (ударыўся галавой аб дно катэра), французскія медыкі даследавалі яго і выявілі, што ад доўгага знаходжання ў вадзе скура на пальцах яго рук і ног выцягнулася, абвісла і ператварылася ў нейкае падабенства перапонак. Нешта падобнае вядома судовым экспертам — у тапельцаў на руках з'яўляецца «пальчатка смерці».

Падабенства гэтых двух выпадкаў і ў тым, што «вадзяны» ў Сене таксама не размаўляў, наогул быў глуханямы. Што датычыць істоты з кагульскіх плаўняў, то яна, магчыма, таксама мела прыроджаны дэфект мовы, што павялічыла яе адчужэнне ад людзей, нежаданне жыць у грамадстве. У выніку — чалавек-выдра, чалавек-бабёр.

А. КАЗАКОЎ.

ІДУЦЬ ЗДЫМКІ

«Інтэрпол»

Рэжысёр-пастаноўшчык Барыс Гарошка на кінастудыі «Грамада» Саюза кінематаграфістаў Беларусі здымае вострасюжэтную карціну «Інтэрпол» па раману Д. Чэйза «Лялька на ланцужку».

Стужка расказвае аб рабоце следчага «Інтэрпола» маёра Шэрмана. У невялікім гарадку Заходняй Беларусі ён «раскручвае» справу, звязаную з наркаманіяй, карупцыяй, наркабізнесам. Ідучы па следзе мацёрых злачынцаў, Шэрман страчвае сваіх памочнікаў, сяброў...

У галоўнай ролі здымаецца курсант Мінскай вышэйшай школы МУС РБ Алег Вялічка. Гэта яго першая работа ў кіно. Ён уладальнік кубка СССР мінулага года па кікбоксінгу. Супрацоўніцу Шэрмана Рэгіну іграе студэнтка Беларускай акадэміі мастацтваў Анжэліка Дайняк.

НА ЗДЫМКАХ: адміністратар Святлана Ястрабава ў час здымак; кадр з будучага фільма, у цэнтры — Шэрман (Алег Вялічка).

Фота Анатоля ДРАЗДОВА.

ШАХМАТЫ

ВЫНІКІ ГАДАВОГА КОНКУРСУ СКЛАДАННЯ

Падведзены вынікі конкурсу складання за 1991 год. На конкурс былі дасланы 87 твораў ад 28 аўтараў. 24 кампазіцыі былі апублікаваны на працягу года.

У многіх творах адчуваюцца хібы тэхнікі: грувасткасць, недастаткова выкарыстана сіла фігур, няўдалы ўступны ход. Кампазіцыі, у якіх былі грубыя дэфекты, зніміліся з конкурсу.

Ніжэй прыводзім лепшыя творы.

Па раздзелу двухходовак 1 месца заняў М. Храмцэвіч (Бабруйск).

Белыя: Крf1, Фс5, Лg5, Са1, Се2, Кf7, Кg4, п. g3 (8).
Чорныя: Кре4, Лd8, Лf8, Сb1, Сh8, Кd4, пп.: d5, e3, f2 (9).
1. Фс3 Кf5! 2. Фс1? Кс2! Рашае. 1. Кfе5! У задачы выканана трохразовая перамена функцый хадоў чорных 1. Ке2 і 1... Кf5. (абарона, абяржэнне, карэкцыруючы ход).

II месца—У. Ярохін (Санкт-Пецярбург).

Белыя: Крb6, Фh4, Лb2, Се3, Сf7, Ка4, Кс2, пп.: d7, f3, g4 (10).
Чорныя: Крd3, Се8, пп: a5, b3, c6, d4, e2, e4, g3, g6 (10).
1. Фе7? е1Ф! 1. Крс5? Са6! Рашае. 1. Фg5!
Тэма Загаруйкі, узмоцненая парадоксам Дамброўскіса ў форме абарон, і тэма Шэдэя.

III месца—Б. Іваноў (Барысаў).

Белыя: Кра2, Фd6, Лс2, Сd5, Ка1, Кb1, пп: c3, f2, f3, g4 (10).
Чорныя: Крd3, Фh6, Ле8, Кh8, пп: a7, d4, d7 (7).
1. g5? Ле2! 1. Фа3? Лb8! 1. с4? Фс1! Рашае 1. cd4!
Твор на перамену матаў.

Па раздзелу трохходовак 1 месца прысуджана С. Цыруліку (Гродзенская вобласць, в. Азяраны).

Белыя: Крb7, Ла7, Сf8, Кf3, Кg5, пп: f4, g4 (7).
Чорныя: Крf6, Ла4, Лh7, Са1, Сb1, Кb3, Кс2, пп: a5, b6, c5, f7, g6, h6 (13).
1. Крс6! ~ 2. К:h7+. 1...Ксd4+, Кb4, Кbd4+ 2. Крd5, Крd6, Крd7 1. Ла6? Лb4!
Добры ўступны ход з цікавай гульнёй белага караля, які кожны раз ходзіць пад шахі.

II месца—В. Волчыку (Лідскі раён).

Белыя: Крс1, Фf1, Лс4, Лg6, Сh3, Кb8, пп, e6, f4 (8).
Чорныя: Крd5, Лf5, Са5, Кf6, пп: c3, d4, d6, e7 (8).
1. Лс6! ~ 2. Фg2+, 1...с2, d3 2. Фf3+, Фd3+
У задачы, на жаль, адзін правільны мат, здзейснена прывязка трох чорных фігур. На самай справе мяняюцца толькі палі, з якіх ферзь дае мат. Калі б у задачы былі сапраўды цікавыя карціны, то твор каціраваўся б вышэй.

III месца—С. Цыруліку (Гродзенская вобласць).

Белыя: Кре1, Ле6, Лh1, Сb2, Кf8, пп: b3, b4, e2, g7 (9).
Чорныя: Крd5, Сh8, пп: c3, d4, f4, f6, g5 (7).
1.0—0! С:g7 2. е4+.
1...f5, c2, d3 2. ghФ, g8К, Лf3.
У творы выканана тэма Баладао (ракіроўка, узяцце на праходзе і пераўтварэнне).

IV месца—М. Бельчыкаву (Барысаў).

Белыя: Крh4, Фа8, Лh3, Лh5 Кс1, п. g4 (6).
Чорныя: Крf4, Лd4, Лf7, Сс4, Кd8, пп: a6, e3, e4, e5, e7, h6 (11).
1. Фс8? е6! Рашае 1. Фb8! ~ 2. Ф:е5× 1...Лd6, Лd5, Кс6. 2. Фb2, Фb6, Фb3.

Па раздзелу шматхадовак 1 месца прысуджана С. Цыруліку (Гродзенская вобласць).

Белыя: Крg4, Фа3, Лс4, Лс8, Са7, Ка4, Ке8, пп: d2, e4, f3, f5, g2, h4 (13).
Чорныя: Кре5, Фс7, Ла8, Лb5, Сf8, Кb1, Кh7, пп: b6, c3, c5, f6, g5 (10).
Мат за 4 хады.
1. g3! ~2. f4+ gf3 gf+
1... Фg7 2. Л:с5+ С:с5 3. d4+
1... Сh6 2. К:с5 Ф:с5 3. d4+
Выканана тэма ўскрыцця лініі для белай фігуры.

У. СЫЧОЎ,
суддзя рэспубліканскай катэгорыі.

(Заканчэнне ў наступным выпуску).

ТЭЛЕБАЧАННЕ

14 лютага

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Роздум аб казцы». Кінанарыс.
9.00. Беларуская літаратура. 7-ы клас.
9.30. «Радасная душа». Фільм-канцэрт.
10.00. «Часовае знікненне лета». Інсцэніроўка паводле вершаў В. Куртаніч.
10.15. «Па следу ўладара». Мастацкі фільм.
15.25. Меркурый.
16.30. Навіны.
16.35. «Ромка, Фомка і Артос». «Верашок». Мультфільмы.
17.25. Сем колераў радасці.
18.00. Дак. фільмы «Флейта», «Ач гяла значыць нежанаты».
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Магілёў).
19.35. Наш каментарый. «Крок да згоды».
19.40. Якія мы гаспадары? Народнае прадпрыемства «Бабруйскдрэў».
20.35. Калыханка.
20.45. Тэлебіржа.
21.00. Экран беларускага кіно. «Хрыстос прызямліўся ў Гародні».
22.25. НІКа.
22.40. Фестываль беларускай песні ў Белавежскай пушчы. Частка 1-я.

І канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.35. «Пеўнік Гок і хітрыя мышкі». Мультфільм.
7.45. Зімнія алімпійскія гульні. Хакей. Матч папяроднага турніру.
9.05. «Там, дзе неба ляжыць на зямлі». Мастацкі фільм.
10.20. ...Да 16 і старэйшым.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. Клуб падарожнікаў (з сурдаперакладам).
12.20. Дак. фільм «У краі гаючых вод»; «Сібір на экране». Кіначасопіс.
13.00. Выступае ансамбль «Адыген».
13.30. Брыдж.
13.45. Бізнес-клас.
14.00. Навіны.
14.20. Зімнія алімпійскія гульні. Санны спорт. Двойкі.
14.45. Хакей. Зборная СНД—зборная Францыі.
16.30. Чалавек і закон.
17.00. Навіны
17.20. Зімнія алімпійскія гульні. Скачкі з трамплінa.
18.10. «Вампіры Геоны». Мультфільм.
18.20. «Мая сям'я і іншыя жырёлы». 6-я серыя.
18.50. «ВІД» прадстаўляе: «Поле цудаў».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. Зімнія алімпійскія гульні. Канькабежны спорт.
21.10. Зімнія алімпійскія гульні. Хакей. Зборная Чэха-Славакіі — зборная Канады. У перапынку (23.00) — Навіны.
23.45. «ВІД» прадстаўляе. «Эльдарада», «Шоу-біржа», «Хіт-канвеер».

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Час дзелавых людзей.
8.20. Англійская мова. 1-ы год навучання.
8.50. Англійская мова. 2-гі год навучання.
9.25. Дзённік Алімпіяды.
10.00. Тэлеасамблея.
11.00. Зімнія алімпійскія гульні. Біятлон.
13.00. Весткі.
15.00. Прастора плюс.
15.30. Дыялогі дылетантаў.
16.00. Хто дапаможа расійскай культуры?
16.15. Дыялог з камп'ютэрам.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Савецкая Армія: трывога, надзея і боль.
18.00. У пошуках згоды.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «Санта-Барбара». 24-я серыя.
20.20. Дзённік Алімпіяды.
20.50. «К-2» прадстаўляе: кінавіктарыну «Ведай нашых», праграму «Каронка»; Мастацкі фільм «На апошнім дыханні» (Францыя). У перапынках: Весткі: На сесіі ВС Расійскай Федэрацыі.

РАДЫЁ

15 лютага

Апошнія паведамленні: 6.00 15.00, 20.00, 23.00. 7.00 — ранішні канцэрт. 8.00 — «Суботнім ранкам». Музычна-публіцыстычны выпуск. 9.15 — гуманітарна-інфармацыйны канал радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная». Праграма «Радыёкантакт». 10.15 — «Званочак». Праграма для маленькіх. 11.00 — «Фальклор». Радыёклуб. 11.30 — праграма радыёстанцыі «Сямейнае радыё» (ЗША). 11.45 — Поп-хваля». Эстрадная праграма. 12.00 — «Увайсці ў кожны дом». 12.30 — «Прысвячанне». Канцэрт класічнай музыкі. 13.00 — «Пямяць сэрца». Радыёчасопіс. 13.30 — «На тэмы дня». Наш каментарый. 13.40 — «Чалавек. Аўтамабіль. Дарога». 14.15 — «Дабрыня дзіцячых сэрцаў». 14.40 — «Даследчык духоўных скарбаў». Да 80-годдзя з дня нараджэння пісьменніка Н. Перкіна. 15.15 — «Паэзія П. Броўкі ў беларускай музыцы». Радыёкампазіцыя. 16.05—«На паваротце». Радыёпраграма для юнацтва. 17.30 — «Спадчына». 18.00 — перадачы абласнога радыё. 19.20 — «Успамін пра песню». Канцэрт з твораў Ю. Семяныкі. 19.45 — вячэрняя казка. 20.00 — «Дзень нашага жыцця». 20.30 — «Вячэрнія зарніцы». 21.00 — «Музычная пошта». 22.00 — «Паўгадзіны з меламанам». Эстрадная праграма. 23. 10 — «Музычны радыёканал».

НА ДВОР'Е

14 лютага

Сёння ўдзень па рэспубліцы чакаецца воблачнае надвор'е, часам 'ападкі, раніцай туман.

Тэмпература паветра ў Брэсце — 6—8, Гродна — 5—7, Мінску — 4—6, Віцебску — 2—4, Магілёве, Гомелі — 3—5 градусаў цяпла.

У наступныя двое сутак характар надвор'я істотна не зменіцца.

Узровень радыяцыйнага гама-фону 13 лютага складаў: у Мінску — 0,01, Віцебску, Гродна — 0,013, Брэсце — 0,010, Гомелі — ад 0,012 да 0,026, Магілёве — 0,012 мілірэнтгена ў гадзіну.

Натуральны радыяцыйны гама-фон на тэрыторыі рэспублікі знаходзіцца ў межах ад 0,010 да 0,020 мілірэнтгена ў гадзіну.

Л. САНКЕВІЧ,
інжынер-сіноптык.

СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ
СЁННЯ Ў НУМАРЫ

У Прэзідыуме Савета Міністраў Беларусі.

«Што дзень наступны нам рыхтуе». Да маючай адбыцца нарады ў Мінску кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў Садружнасці.

Новае ў купоннай сістэме.

Музы і рынак. **«Шанцаў на выжывание нима?!»**

Вёска: зямельная рэформа. **«Поле бою».** Заканчэнне.

Зварот украінскай навукова-прамысловай асацыяцыі дзелавога супрацоўніцтва «Славуціч» да вышэйшых кіраўнікоў Украіны, Расіі, Беларусі.

Аб тым, што хвалюе. **«Да хворага... на спадарожнай».**

За і супраць. **«Дом мэблі?» «Сардэчна запрашаем».**

У садзе і агародзе. Падборка.

Узровень радыяцыйнага гама-фону.

Фільмы тыдня.

Праграма тэлеперадач на тыдзень.

Галоўны рэдактар У. Б. НАРКЕВІЧ.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда».

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 32-51-05, аддзела пісьмаў—32-04-52, 32-41-92, навін—32-15-02, даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-35-91.

ПА НУМАРУ ДЗЯЖУРЫЛІ: член рэдакцыйнай калегіі Іван Бараноўскі, намеснік адказнага сакратара Віктар Краўчанка, старшы карэктар Вікторыя Клянновік.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». Тыраж 81.098. Індэкс 63.850. Зак. № 32. Выходзіць 250 разоў на год. Нумар падпісаны ў 21.05.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ШКОЛА ПАВОДЗІН

Вы прыйшлі на прыём...

З уласнай практыкі вы, напэўна, ведаеце: іншы раз рашэнне нейкага нязначнага пытання расцягваецца на доўгі час. Пры гэтым абцякальныя, малазначныя фразы, сумны голас субяседніка даюць зразумець, што канкрэтнай размовы так і не будзе. А здараецца, важная справа вырашаецца за некалькі хвілін. Прасцей за ўсё такія розныя вынікі растлумачыць тым, што звяртаешся да розных людзей — і бюракратаў, і талковых, адказных. Але ва ўсякай дзелавой размове ёсць «тэхналагічны» момант — умение весці гутарку.

Пра гэта і капамінае журналіст Марына ГАРАЕВА.

Прыпомніце ваш уласны ўдзел у той або іншай размове: можа, нешта ў вашых словах, нават ў выразе твару дазволіла бюракрату адчуць, што вырашаемае пытанне не вельмі важнае, што можна ўхіліцца ад неабходнасці прымаць рашэнне, браць на сябе адказнасць. А ў другі раз вы, ведаючы, што справа не церпіць прамаруджвання, так падрыхтаваліся да размовы, праявілі такую настойлівасць, знайшлі такія важкія доказы, што запярэчыць не было як. Значыць, у кожным выпадку значную ролю адыгрываюць падрыхтаванасць, настрой, паводзіны. Калі ў выніку такога самааналізу ў вас узнікне жаданне больш даведацца аб тым, як трэба весці дзелавы дыялог, мы можам параіць кнігу Л. В. Уласава і В. Н. Гладкова «Сакратар кіраўніка ўстановы», паколькі вопыт сакратара найбольш універсальны.

Такім чынам, вы пачынаеце размову. Але толькі не з негатыўных фактаў. Старайцеся з першых слоў не пералічваць прычын, якія перашкаджаюць вырашэнню праблемы. Гэта выкліча міжвольны пратэст. Паспрабуйце спакваля падказаць рашэнне, падвесці субяседніка да жаданага вываду, прычым так, каб гэта выглядала вынікам яго ўласнага роздуму. Задача няпростая. Як яна вырашаецца, залежыць, вядома, і ад абставін, і ад сутнасці пытання. Можна паспрабаваць, напрыклад, уцягнуць чалавека ў сумеснае абдумванне, у пошук магчымых варыянтаў рашэння. Пры гэтым дакладна сфармулюйце мэты, старайцеся не быць шматслоўным.

Аснова гутаркі — правільна сфармуляваныя пытанні. Прынцыпова важныя пытанні трэба ставіць такім чынам, каб субяседнік павінен быў выбраць адно з двух магчымых рашэнняў. Калі ўсё ж субяседнікі не прыйшлі да адзінай думкі і адзін з іх павінен у нечым адмовіць другому, трэба тактоўна растлумачыць прычыны адмовы, не выказваючыся безапеляцыйна, што б'е па чалавечай годнасці.

У наведвальніка ні ў якім разе не павінна ўзнікаць непрыемнага адчування, што да яго няўважліва паставіліся або не захацелі дапамагчы. Ён павінен зразумець, што або яго довады аказаліся недастаткова важкімі, або нейкія аб'ектыўныя прычыны сапраўды не на яго карысць.

ЯК БЫЦЬ ПРЫГОЖАЙ

Тонкая талія

Кожнай гістарычнай эпосе адпавядае сваё ўяўленне аб прыгажосці і гармоніі жаночай фігуры. Ідэальная фігура нашай сучасніцы павінна мець аднолькавыя аб'ёмы грудзей і бёдраў, а аб'ём таліі — на 25 см меншы за бёдры.

У кожнага чалавека свой ідэал прыгажосці, фігуры, які вызначаецца не толькі модай, але і ўласным густам. Але якім бы ні было ваша індывідуальнае паняцце аб прыгажосці жаночай фігуры, адной з бясспрэчных якасцей павінна быць тонкая і гібкая талія.

Прыгажосць таліі можна падкрэсліць і зрокава выправіць пры дапамозе фасону адзення і некаторых яго дэталей. У мінулым для стварэння тонкай таліі жанчыны зацягваліся ў тугія карсеты, часта наносячы непапраўную шкоду ўнутраным органам (асабліва печані і падстраўнікавай залозе), грацыёзнасць таліі падкрэслівалі крыналіны, босы (невялікія падушачкі на жываце) і турнюры (спецыяльныя падушачкі, што размяшчаліся ніжэй таліі ззаду). Але гэта ўсё ў мінулым. Цяпер, калі паступова змяншаецца аб'ём адзення, адным з галоўных аксесуараў становіцца пояс. Аднак нельга бяздумна прытрымлівацца моды, бо пояс, асабліва шырокі, можа падкрэсліць недахопы вашай фігуры.

Калі ў вас высокая талія — пазбягайце шырокіх паясоў, яны больш падыходзяць жанчынам з нізкай таліяй. Жанчынам з тонкай, але высокай таліяй лепш тонкія паясы на таліі ці фігурныя паясы, распластаныя па бёдрах ніжэй таліі.

Жанчынам з шырокімі плячамі, поўнымі грудзямі і вузкімі бёдрамі не варта падкрэсліваць талію, ім падыходзяць вузкія спадніцы, дапоўненыя свабоднай камізэлькай або тунікай.

А жанчынам з вузкімі плячамі і шырокімі бёдрамі рэкамендуем шырокія спадніцы, падкрэсленыя ніжнімі спадніцамі, якія таксама ўваходзяць у моду і шырокі (калі дазваляе талія) пояс.

Увечары — госці

...А сустрэць іх хочацца свежай і бадзёрай. Як гэтага дасягнуць, падказвае касметолаг.

Гадзіны за паўтары да прыходу гасцей ачысціце твар касметычным малачком, пратрыце кубікам лёду (лёд трэба прыгатаваць загадзя з адвару мяты, рамонку і святаяннікі), на вільготную скуру нанясіце пажыўны крэм (адпаведна тыпу скуры).

Каб крэм, а разам з ім неабходная вільгаць хутчэй насыцілі скуру, накрыйце твар і шыю змочанай у цёплай вадзе сурвэткай і ляжце на цвёрдую канапу, паклаўшы пад ногі аднудзве падушкі. Пастарайцеся максімальна расслабіцца. Праз дваццаць хвілін станьце пад халаднаваты душ, змыйце крэм моцнай струёй, калі трэба, памыйце галаву. І адразу ж падсушыце валасы сагрэтым ручнікам. Затым разатрыце ручнікам цела, а твар і шыю яшчэ раз пратрыце кубікам лёду і зноў пакладзіце тонкі слой крэму.

Адразу пасля душу на скуру наносяць духі — мазкамі шклянога корка ад флакона: на патыліцу, шыю, згібы рук. І можна заняцца дэкаратыўнай касметыкай.

Калі грым накладзены, а валасы дастаткова высахлі, пры дапамозе электрашчыпцоў, шчотак і фена зрабіце прыгожую прычоску.

І, нарэшце, прывядзіце ў парадак пазногці і пакладзіце свежы лак — з улікам каляровай гамы строю, памады для вуснаў і ўпрыгажэнняў.

СПРАВЫ САРДЭЧНЫЯ

Самы кароткі шлях да сэрца мужчын

КАХАННЕ БЕЗ АДКАЗУ... У старажытныя часы ўсё было, здаецца, прасцей: ідзеш да чараўніцы і атрымліваеш нагаворнае зелле, гатовае да ўжывання, ці канцэнтрат са спецыяльна прыгатаваных перапонак кажана і сушанай жабы. Даеш гэта выпіць ці з'есці бессардэчнаму — і гатова справа: ён глядзіць на цябе зусім іншымі вачамі! З развіццём навукі ўсё ўскладнілася. Старыя чараўніцы памерлі, іх месца занялі маладыя сімпатычныя жанчыны-хімікі з вышэйшай адукацыяй. Але давайце паспрабуем адрадзіць нагаворнае зелле з дапамогай сучаснай навукі.

Зыходны пункт ясны: даўно вядома, што шлях да сэрца мужчыны ляжыць праз страўнік! Чым жа трэба пачаставаць каханага, каб абудзіць і ўзмацніць яго пачуцці? У Старажытнай Грэцыі добрай «нагаворнай» славай карысталіся стравы з рыбы. Такім чынам, першы рэцэпт гатовы: карміце выбранніка сэрца як мага часцей дарамі мора! Стравы з рыбы пры гэтым пастарайцеся не шкадуючы прыправіць імбіром, карыцай і цыбуляй, у крайнім выпадку толькі цыбуляй.

Памідоры ў старажытнасці называлі «яблыкамі кахання» — «пома-д-амор». Значыцца, на закуску падаём салату са свежых памідораў, запраўленых пятрушкай, часнаком, мятай.

Потым пераходзім да першай стравы. Любоўны суп звычайна ўключаў дробна расцёрты часнок, перац, сельдэрэй і труфелі (рэцэпт мадам дэ Пампадур). З труфелямі, відаць, узнікнуць цяжкасці, усё ж астатняе зусім даступна.

Далей ідзе другая страва, як мы ўжо дамовіліся, — рыбная. Кацярына Медзічы рэкамендавала падаваць да яе артышокі, якія яна высока цаніла як узбуджальнік кахання. Цяперашні іх заменнік — бульбяное пюрэ. Не адчайвайцеся, калі чаго-небудзь не знойдзеце ў продажы: на думку сучасных спецыялістаў, любы прадукт, багаты лёгказасваяльным бялком, — нагаворнае зелле!

Напаследак напоім выбранніка «чаем». На пытанне: «Што гэта ты прыгатавала?» — з мілай усмешкай адказвайце: «Грузінскі чай, другі ж цяпер не прадаюць!» «Чай» жа гатуем так: 4 калівы чабору, 2 — мяты і каліва размарыну (можна замяніць зялёным чаем) заліваем у тэрмасе паўлітрам кіпню, і праз 10 мінут напітак гатовы. «Чай» гэты трэба піць на працягу трох месяцаў удваіх, па вечарах, як гэта рабілі Трыстан і Ізольда. Поспех гарантаваны!

Ну, а што рабіць, калі вы атрымалі сардэчную рану? На дапамогу прыйдзе нагаворнае зелле, а менавіта шакалад. Кажуць, рэгулярнае ўжыванне шакаладу здымае стрэс. Толькі сцеражыцеся: захапіўшыся салодкім, вы можаце сапсаваць фігуру.

Ужо калі ёсць нагаворныя і адгаворныя зеллі, не можа не быць «ад варот паваротных»—калі вам трэба пазбавіцца ад надакучлівага кавалера. Такое зелле ў кожнай жанчыны сваё.

«ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ» падрыхтавана па пісьмах чытачоў, у ёй выкарыстаны парады спецыялістаў розных профіляў, матэрыялы друку—беларускага, іншых рэспублік Садружнасці, замежнага.

Запрашаем чытачоў больш актыўна ўдзельнічаць у падрыхтоўцы чарговых выпускаў «ХАТНЯЙ ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ».